ЛІТАРАТУРА і мастацтва



3 чэрвеня 2005 г. № 22/4309

АНОНС!

Працоўны дзень старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Мікалая Чаргінца распісаны калі не па хвілінах, то да чвэрці гадзіны — адназначна! Тых, хто ідзе ў ягоны кабінет з дзяржаўнай справай ці ўласнай бядой, здаецца, не злічыць. Што, дарэчы, і не здзіўляе. Наўрад ці каму ў краіне яшчэ невядомае прозвішча гэтага папулярнага пісьменніка, палітыка, генерал-лейтэнанта .

СТАР. 5

Прагноз адносна распаўсюджвання і жыццяздольнасці сучасных моў несуцяшальны: з 6700 існуючых сёння 90 працэнтаў пазбавяцца свайго практычнага значэння на працягу бліжэйшых ста гадоў. Зараз з вялікім адрывам лідзіруе англійская мова. Больш чым у 50 краінах свету яна мае статус дзяржаўнай. Добра гэта ці кепска? Попыт на спецыялістаў з веданнем замежнай мовы ў свеце выглядае так: нямецкая — 13 працэнтаў, французская — 7, іспанская і італьянская — 3, англійская — 77 працэнтаў.

СТАР. 12-13

Час — Еўрапейскі!

"Музы Нясвіжа" царавалі ў некаранаванай нашай сталіцы дзесяты раз. Дабратворны дух традыцый і абнаўлення атуляў найцудоўны беларускі фестываль. Два майскія дні — а колькі ў іх жыцця! Падзей, сустрэч. Свежых уражанняў і ведаў. Узнёслых эмоцый. Зладжаны па ініцыятыве Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі на чале з маэстра Міхалам Фінбергам, падтрыманы ўладамі Нясвіжа, кіраўніцтвам сталічнай вобласці, фэст у старажытным горадзе радуе і здзіўляе. Глыбінёй і актуальнасцю вызначаліся прамовы ўдзельнікаў навукова-практычнай канферэнцыі "Мастацкая спадчына Нясвіжа". Захаплялі выстаўкі: ужо шосты паказ творчасці юных выхаванцаў мастацкай студыі Палаца культуры Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода і вернісаж архіўных фота, прадстаўленых філіялам Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі, што ў Залессі.

Мастацтва музычнае, як вядома, яднае ўсіх нясвіжскіх муз ды нязменна ўражвае размаітасцю імпрэз і майстэрствам выканаўцаў. Сёлета дзве вялікія акадэмічныя канцэртныя праграмы прадставілі старонкі беларускай класічнай спадчыны і творы нашых сучаснікаў. Яскрава і шчыра прайшла сустрэча з джазам. Кранальным атрымаўся фестывальны дэбют нясвіжскіх музыкантаў. А матывы святкавання юбілею Вялікай Перамогі дадала да нясвіжскай поліфаніі музычна-харэаграфічная імпрэза на цэнтральнай плошчы, паблізу старажытнай ратушы, дзе не так даўно ажыў-загаварыў гадзіннік, адлічваючы новы час. Госці, якія наведваюць фестываль штогод, з прыемнасцю адкрываюць у знаёмых кутках слынай мясціны ўсё новыя рысы аблічча еўрапейскага горада. У справах яго людзей, у самой атмасферы ўпэўнена гучыць голас адраджэння багатай і непаўторнай беларускай культуры, голас гістарычнай годнасці нашай і — суверэннай будучыні.

Фота Дзмітрыя ЯШЧАНКІ

Калаж В. КАЛІНІНА

СТАР. 10

У юбілейны 2005...

На жаль, для Беларусі май 1945-га года не стаў канчаткова пераможным. І, хоць нямецкі бот больш не таптаў беларускія палеткі, людзі працягвалі змагацца...

Змагацца за некалі квітнеючыя гарады і вёскі, што ператварыліся ў суцэльныя папялішчы, за адраджэнне роднага краю, разбуранага вайной...

Менавіта бессмяротнаму подзвігу працоўнага народа і прысвечана выстава "У пераможным 1945-м", падрыхтаваная сумеснымі намаганнямі музея гісторыі і культуры Беларусі, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі. У экспазіцыі самыя разнастайныя дакументы: ад афіцыйных пастаноў і дакладаў (дарэчы, тут можна азнаёміцца з унікальнымі паперамі "Асобай папкі" І. Сталіна) да тагачасных нумароў газет "Звязда" і "Савецкая Беларусь." Знайшлося таксама месца для старэнькага Буквара, часопісаў "Вожык" і "Полымя", зборнікаў вершаў...

Здавалася б, сухія лічбы і факты не здольны перадаць асаблівага настрою першых пасляваенных год. Але, менавіта дзякуючы ім, уяўляеш, у якой згодзе і ўзаемаразуменні працавалі і жылі тады людзі. Незвычайна цёплыя пачуцці выклікае ўжо толькі адзін ліст ваентэхніка А.М. Расінскага:

Дарагія землякі!

Паведамляю вам, што мы знайшлі вашу бібліятэку... (гаворка ідзе пра кнігі бібліятэкі імя Леніна).

Наперадзе яшчэ столькі клопатаў і выпрабаванняў, а людзі шчыра радуюцца знойдзеным кніжкам! Жыццё працягваецца... У рамках адкрыцця выставы прайшла прэзентацыя зборнікаў "Авіяцыя — партызанам. 1941—1944. Дакументы і ўспаміны" і "Вызваленая Беларусь (верасень 1943 — снежань1945)". Як зазначыў старшыня Камітэта па архівах і справаводстве Уладзімір Іванавіч Адамушка, "большасць дакументаў, змешчаных у гэтых кнігах, публікуецца ўпершыню. Напрыклад, матэрыялы з асобага сектара ЦК Кампартыі Беларусі да сённяшняга дня вывучаліся выключна даследчыкамі. Увогуле, гэтыя выданні пабачылі свет, дзякуючы не толькі тытанічнай працы архівістаў, але і актыўнай дапамозе ветэранаў. Ім, а таксама загінуўшым абаронцам нашай будучыні і прысвечаны прэзентуемыя кнігі..."

Да 60-годдзя Вялікай Перамогі прымеркавана шмат мерапрыемстваў, але куратар выставы, Таццяна Воранава, выказала спадзяванне, што экспазіцыя "У пераможным 1945-м" не згубіцца сярод іншых і здолее прыцягнуць увагу як людзей сталага ўзросту, так і моладзі, дзеля выхавання якой прыкладаецца столькі намаганняў. Адметна, што выставы такога кшталту будуць праводзіцца і надалей. Па словах Таццяны Рыгораўны, "дваццатае стагоддзе пакінула асабліва глыбокі след у гістарычных дакументах, непадкупных сведках даўно мінулых дзён. Дзякуючы ж актыўнаму супрацоўніцтву музейшчыкаў і архівістаў, кожны з жадаючых атрымае магчымасць азнаёміцца з гэтымі унікальнымі матэрыяламі".

Святлана САЎКО
Фота аўтара

Распавядаюць ... маркі

Больш за 20 тысяч паштовых марак і канвертаў можна ўбачыць на філатэлістычнай выставе, што працуе ў музеі абароны мемарыяльнага комплексу "Брэсцкая крэпасць-герой".

У якасці яе арганізатараў выступілі Брэсцкі аблвыканкам, Міністэрства сувязі, РУП "Белпошта", мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой". Пераважная большасць экспанатаў выставы — самыя непасрэдныя "сведкі" падзей ваеннага часу. Да прыкладу, багата старонак паштовай гісторыі сабрана ў раздзелах "Палявая пошта" і "Ваенная пошта". А вось маркі і канверты, якія былі выпушчаны да 60-годдзя вызвалення Беларусі, "знайшлі" сабе асобнае пачэснае месца ў выглядзе спецыяльнага стэнда.

Дарэчы, матэрыялы для экспазіцыі прадастаўлены як вядучымі філатэлістамі краіны, так і "Белпоштай".

Іна ЛАЗАРАВА

Майстры, вучні, моладзь...

У мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" да шостага чэрвеня працуе выстаўка мастакоў-мастацтвазнаўцаў "Універсум".

Задача аўтараў экспазіцыі — сваім непасрэдным прыкладам ажывіць шырокія пошукі ва ўсіх відах творчасці, прадэманстраваць ідэйнае аднадумства і мастацкую свабоду. Мастакі-прафесіяналы, якія адначасова займаюцца даследаваннямі, з'яўляюцца актыўнымі мастацкімі крытыкамі, падтрымліваюць і развіваюць жывыя рэнесансныя традыцыі універсальных сувязяў навукі і мастацтва. Іх усіх аб'ядноўвае жаданне адраджаць даследчыя, наватарскія задачы мастацтва, якія былі закладзены майстрамі Адраджэння.

Фота К. ДРОБАВА

Сярод удзельнікаў выстаўкі — дактары і кандыдаты мастацтвазнаўства: В.Шматаў, В.Жук, Л.Налівайка, А.Атраховіч, М.Баразна, Р.Шаура, У.Рынкевіч, а таксама Ю.Піскун, Я.Шунейка, Г.Мяшкова, Г.Барвенава, А.Тарановіч, Ю.Барысевіч.

Поруч з вядомымі даследчыкамі і крытыкамі свае работы дэманструюць прадстаўнікі навукова-мастацкай моладзі, аспіранты К.Крыуліна, А.Шычко, Д.Іваноўская, Г.Ціханава, В.Кірэева і іншыя.

Ёсць на выстаўцы і месца для твораў прадстаўнікоў старэйшага пакалення мастацтвазнаўцаў, якія пакінулі ўжо гэты свет: П.Масленікаў, Л.Дробаў, У.Бойка, Ю.Карачун і Г.Сокалаў-Кубай.

В.К.

Прыгажуня прачнулася!

Мінская прэм'ера балета-феерыі "Казка пра спячую прынцэсу" на музыку П.Чайкоўскага, прысвечаная 165-годдзю з дня нараджэння кампазітара, адбылася ў Беларускім дзяржаўным музычным тэатры. Што значыць "мінская"? А тое, што першымі новы спектакль пабачылі гледачы Германіі ды Швейцарыі, дзе нядаўна пабываў з гастролямі наш калектыў. Няцяжка здагадацца, што тэатр прапанаваў сваю, двухактовую версію класічнай "Спячай красуні" (таму і назва балета зменена). Харэаграфія Марыуса Пеціпа, а таксама Ніны Дзячэнкі, яе ж — сцэнічная рэдакцыя і пастаноўка. Музычны кіраўнік і дырыжор — Аляксандр Сасноўскі, сцэнаграфія Яўгена Ждана, мастак па касцюмах Алена Пашкевіч. Сярод выканаўцаў галоўных партый — Рына Івакіры, Канстанцін Кузняцоў, Наталля Коўш, Мая Янсан.

С.Б.
Фота Яся КАВАЛЕВІЧА

Шчыра і адкрыта

Напярэдадні Вялікай Перамогі, на філалагічным факультэце БДУ адбылася сустрэча студэнтаў, аспірантаў і выкладчыкаў факультэта з выдатным пісьменнікам, ветэранам Вялікай Айчыннай вайны Алесем Савіцкім. Загадчык кафедры беларускай літаратуры і культуры Т.І.Шамякіна прадставіла госця як чалавека ў многіх сэнсах унікальнага — "аднаго з самых маладых душой і таленавітых ветэранаў Беларусі". Пісьменнік нарадзіўся ў "слаўным горадзе Полацку", яшчэ падлеткам удзельнічаў у партызанскім руху, узначальваў падрыўную групу атрада "Бальшавік" брыгады імя Варашылава на Віцебшчыне. У 1944—45 гг. у складзе Савецкай Арміі вызваляў Літву, Польшчу, дайшоў да Берліна, распісаўся на сцяне рэйхстага. А. Савіцкі — аўтар шматлікіх аповесцей і раманаў, якія карыстаюцца шырокай папулярнасцю ў чытачоў. Ён лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі і Дзяржаўнай прэміі РБ. Падчас сустрэчы Алесь Ануфрыевіч не столькі гаварыў пра сябе, колькі ўспамінаў пра сваіх баявых таварышаў, усіх, хто не дажыў да Перамогі. Творца адказаў на шматлікія пытанні прысутных. Між іншым, і сам задаваў настолькі цікавыя пытанні, што выкладчыкі ацанілі іх як выдатную метадычную знаходку. Студэнты былі ўражаныя і біяграфіяй выдатнага чалавека, і яго прамоўніцкім майстэрствам, і шчырасцю, адкрытасцю выказванняў.

Н.К.

УМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ

творчага конкурсу сярод аўтараў і журналістаў сродкаў масавай інфармацыі

Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь пры садзейнічанні Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь абвяшчае творчы конкурс сярод аўтараў і журналістаў сродкаў масавай інфармацыі на лепшае асвятленне тэм аб міжнацыянальных адносінах, міжкультурным дыялогу, узаемапавазе паміж людзьмі розных нацыянальнасцей у Рэспубліцы Беларусь, статутнай дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей, дружбе паміж народамі.

Конкурс праводзіцца з мэтай умацавання і развіцця беларускіх традыцый мірнага суіснавання і паважлівых узаемаадносін людзей, незалежна ад нацыянальнай прыналежнасці, папулярызацыі каштоўнасці культурнай разнастайнасці і прадухілення магчымых канфліктаў на этнічнай глебе.

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца аўтары і журналісты гарадскіх, раённых, абласных, рэспубліканскіх газет і часопісаў, тэлерадыёкампаній незалежна ад формы ўласнасці.

Конкурс праводзіцца з 5 мая 2005 г. да 5 мая 2006 г.

Удзельнікі конкурсу дасылаюць па 1 экземпляру выданняў з надрукаванымі за азначаны перыяд матэрыяламі, дадаўшы пры гэтым дадзеныя аб аўтары: прозвішча, імя, імя па бацьку, год нараджэння, месца работы, пасада, адрас і тэлефонны кантактны нумар.

Электронныя сродкі масавай інфармацыі прадстаўляюць аўдыёвідэазапісы радыётэлесюжэтаў і праграм па вышэйазначанай тэматыцы з дадзенымі аб аўтарах, тэрмінах выхаду ў эфір.

Конкурсныя матэрыялы на друкаваных і электронных носьбітах прадстаўляюцца ў Камітэт да 5 мая 2006 г. (220029 г. Мінск, вул. Камуністычная, 11, тэл./факс 284-63-44, кантактны тэл. 288-20-28).

Пераможцамі конкурсу вызначаюцца за лепшыя матэрыялы адзін аўтар друкаваных СМІ і адзін аўтар электронных СМІ, кожны з якіх узнагароджваецца Ганаровай граматай Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь і каштоўным падарункам.

Вызначаюцца таксама па 2 аўтары — прадстаўнікі друкаваных і электронных СМІ за высакаякаснае асвятленне тэматыкі конкурсу, якім уручаюцца Падзячныя пісьмы Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь і заахвочвальныя прызы.

Узнагароджанне пераможцаў конкурсу прадугледжана ў рамках заключных мерапрыемстваў VI Усебеларускага фестывалю нацыянальных культур, якія адбудуцца ў першай дэкадзе чэрвеня 2006 г. у г. Гродна.

"Вясёлка" — лепшы сярод дзіцячаюнацкіх часопісаў Беларусі! Гэтак прызнала журы першага Нацыянальнага конкурсу, які праводзіла Міністэрства інфармацыі нашай рэспублікі. Узнагароды конкурсу — прыгожая бронзавая статуэтка "Залатая ліцера" і дыплом, якія вы бачыце на здымку.

Вялікая заслуга ў гэтай перамозе ўсіх сяброў "Вясёлкі" — супрацоўнікаў рэдакцыі, пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў і юных аўтараў.

Раней "Вясёлка" была ўзнагароджана Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР і Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, сярэбраным медалём ВДНГ СССР.

Н.К.

Водныя маршруты з беларускай іскрынкай

Беларусь у сённяшнім яе выглядзе ў параўнанні з той жа урбанізаванай і прыгладжанай Заходняй Еўропай літаральна створана для экалагічнага турызму, які можа ўзяць у сваю скарбонку не толькі унікальную і багатую, як на раслінны, так і на жывёльны свет прыроду, але і разнастайную культурную спадчыну. Адзін з цікавых і перспектыўных напрамкаў экатурызму — водныя маршруты. Што сёння і ў бліжэйшым будучым можа прапанаваць у гэтым кірунку турыстычная галіна?



Як зазначыла галоўны спецыяліст упраўлення турызму Міністэрства спорту і турызму **Людміла Цяцерына**, цяпер у рэспубліцы актыўна праводзіцца рэканструкцыя сістэмы буйнейшых водных каналаў. Плануецца, што 1 ліпеня 2006 года будзе ўведзена ў эксплуатацыю першая чарга Аўгустоўскага канала, які размешчаны на паўночным усходзе Польшчы і ў Гродзенскім раёне ды аб'ядноўвае Віслу з Нёманам. Яго даўжыня — 102 кіламетры (на тэрыторыі Беларусі ўсяго 22). Пабудаваны ў 1824-1839 гадах, каб стварыць водны шлях для перавозкі грузаў з басейна Дняпра (па Дняпроўска-Бугскім канале), Віслы і Нёмана да Балтыйскага мора. Складаецца з сістэмы каналаў, азёр, сажалак, каналізаваных участкаў рэк і пратокаў. Поўнае ўзнаўленне гэтага памятніка гідратэхнічнага будаўніцтва, лічаць спецыялісты, мела б вялікае міжнароднае значэнне. Вынікі папярэдніх абследаванняў паказалі: флора рэгіёна вельмі своеасаблівая і з'яўляецца, з аднаго боку, тыповай для Сярэдняга Нёмана, а з другога, па-свойму унікальнай — у яе складзе маецца шэраг рэдкіх відаў раслін.

Увага да Аўгустоўскага канала з боку дзяржавы павысіла цікавасць да населеных пунктаў, размешчаных паблізу, і ў тамтэйшых жыхароў, і — нават у першую чаргу — у гродзенцаў. Людзі купляюць участкі зямлі пад новае будаўніцтва, гатовыя дамы, якія пасля капітальна рамантуюць. Праект узнаўлення гэтай воднай артэрыі прадугледжвае захаванне элементаў ландшафту, што маюць культурнае, гістарычнае і мастацкае значэнне, — даўнейшыя пасяленні, адметнасці рэльефу, водныя збудаванні, лясныя масівы, дрэвы ва ўзросце 100 і больш гадоў.

— Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмай запланавана накіраваць на гэтыя мэты больш 20 мільярдаў рублёў, — падкрэсліла Людміла Цяцерына. — Тут ужо рэалізуецца сем інвестпраектаў, якія дазволяць зрабіць Аўгустоўскі канал суднаходным і стварыць вакол яго развітую турыстычную інфраструктуру.

Пачаты работы і па рэканструкцыі канала Агінскага, які знаходзіцца ў Пінскім і Івацэвіцкім раёнах і ўяўляе сабою частку былога Дняпроўска-Нёманскага шляху. Праз Шчару і Ясельду злучае басейны рэк Нёмана і Прыпяці. Разам з Выганашчанскім возерам яго даўжыня складае 54 кіламетры. Будаваўся ў 1767—1783 гадах па ініцыятыве і на сродкі магната Міхаіла Казіміра Агінскага для перавозу грузаў, пераважна лесу. Да 1941 года быў суднаходным, потым абмялеў. Вандроўка па такім маршруце — гэта не толькі паглыбленне ў некранутую прыроду з непраходнымі лясамі і бясконцымі балотамі беларускага Палесся (што само па сабе з'яўляецца іскрынкай для турыстаў з развітых краін), але яшчэ і экскурсія ў гісторыю нашай радзімы і перадваеннай Еўропы.

— Пасля таго, як на канале правядуць пэўныя работы, стане магчымым праход суднаў праз возера Выгашчанскае, па рэках Нёман і Шчара праз Аўгустоўскі канал будзе мецца выхад на Польшчу і балтыйскія краіны, а праз Прыпяць — на дзяржавы Міжземнамор'я. Пакуль ён будзе прызначаны для спартыўна-аздараўленчага турызму. Але ў далейшым плануецца ўзвесці сістэму інжынерных збудаванняў, якія злучаць каналы Агінскага і Днепра-Бугскі, — паведаміла Людміла Цяцерына.

Што ж уяўляе сабою Днепра-Бугскі канал? Ён злучае раку Піна (левы прыток Прыпяці) з Мухаўцом, правым прытокам Заходняга Буга, і з'яўляецца самым вялікім штучным водным шляхам Беларусі. Будаваўся з перапынкамі з 1775 па 1848 год. У 1939-м канал рэканструявалі і ён стаў суднаходным. Яго даўжыня дасягнула 93 кіламетраў. Пакуль жа ён служыць толькі для перавозкі грузаў.

Як стала вядома, ужо вядуцца перамовы з польскім бокам аб тым, каб адкрыць шлюз на рацэ Заходні Буг. У выніку ўсе тры каналы — Аўгустоўскі, Агінскі і Днепра-Бугскі — утвораць адзіную сістэму міжнароднага значэння. Такім чынам будзе ўзноўлена беларуская частка старадаўняга воднага шляху "з вараг у грэкі", які вёў з Балтыйскага мора ў Чорнае.

Раіса МАРЧУК

На здымках: схема планіровачных участкаў зоны Аўгустоўскага канала; шлюз "Дамброўка" (да пачатку работ па рэканструкцыі).

Фотаздымкі забяспечаны аўтарам.

І нараджалася плынь...

Прачытана кінематографам яшчэ адна старонка беларускай прозы — ваеннай прозы класіка айчыннай літаратуры Івана Шамякіна. Новы твор Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" захаваў назву першакрыніцы: "Глыбокая плынь". Яго прэм'ерны паказ адбыўся ў кінатэатрах краіны напярэдадні святкавання 60-годдзя Вялікай Перамогі. Дарэчы, беларускія СМІ апублікавалі меркаванне Прэзідэнта РБ, выказанае ім пасля прагляду гэтай работы нашых кінематаграфістаў. Як зазначыў А.Лукашэнка, фільм "Глыбокая плынь" дае магчымасць сучаснаму гледачу зразумець сутнасць партызанскага руху ў Беларусі. А гэта значыць — зразумець наш народ, вытокі яго мужнасці і стойкасці, характар і жыццёвыя каштоўнасці народа-працаўніка, воіна, які самааддана абараняе свой дом, сваю Радзіму, сваю сям'ю.

У сваіх інтэрв'ю падчас кіназдымак рэжысёр-пастаноўшчык М.Касымава падкрэслівала, як важна паказаць сённяшняму, найперш маладому, гледачу працэс нараджэння партызанскага руху на Беларусі. Пачаткам была невялікая група людзей; затым, як ручаямі поўніцца рэчышча і ўтвараецца глыбокая плынь вонкава спакойнай ракі, з гэтых ручаінак народнага патрыятычнага руху ўзнялася магутная і непераадольная для ворага хваля ўсенароднай партызанскай барацьбы, што ўвайшла ў сусветную гісторыю своеадметнай, менавіта беларускай, старонкай. Як вядома, нараджэнне гэтай "глыбокай плыні" паслядоўна і вобразна выразна прасочваецца ў хрэстаматыйным творы І.Шамякіна. І, дарэчы, кіраўнік нашай дзяржавы, зважаючы на важнасць тэматыкі, лічыць магчымым стварэнне працягу кінастужкі "Глыбокая плынь", якая, на яго думку, знятая ў добрых, праверaных часам, традыцыях айчыннага кінематографа.

Алесь САЧАНКА

Фота А.ДЗМІТРЫЕВА

Майстар незапазычаных думак

Так назваў Леанід Дранько-Майсюк пісьменніка і крытыка Пятра Васючэнку, прэзентацыя кнігі "Адлюстраванні першатвора" якога адбылася ў Доме літаратара. Як адзначыў сам аўтар, свой роздум пра літаратуру ён дзеля лёгкасці і займальнасці прачытання ўклаў у кароткія іранічныя тэксты. У аснове кнігі, зноў жа па прызнанні П.Васючэнкі, — наступная думка: не толькі жыццё "творыць" літаратуру, але і літаратура "творыць" жыццё.

Прывітаць і павіншаваць пісьменніка прыйшлі калегі, сябры, героі яго кнігі: Віктар Шніп, Людміла Рублеўская, Зміцер Вішнёў, Валянціна Аксак, Аксана Спрынчан, Віка Трэнас і многія іншыя.

Н.Я.

«Перамога, якая нас яднае»

Такую назву мае выстава, што адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі па ініцыятыве Пасольства Расійскай Федэрацыі. Тут прадстаўлены работы мастакоў, якія жывуць і працуюць на Беларусі, але родам з розных гарадоў і вёсак Расіі. Большасць экспанаваных твораў — з фонду Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Гэта работы класікаў беларускага жывапісу: "За спробу ўцёку" А. Шыбнёва, "К. Заслонаў дае заданне" У. Хрусталёва. Сапраўды знакавай работай на выставе стала "Пераправа" Аляксандра Дэмарына. Гэта вялікае шматфігурнае палатно — своеасаблівы сімвал, які аб'ядноўвае сучаснае пакаленне з тым берагам, дзе засталася вайна, гераізм, пакуты.

Экспанатамі выставы сталі не толькі жывапісныя работы, але і скульптурныя партрэты ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, скульптуры "Нескароны" Х. Асадулаева і "Супрацьстаянне" Э. Астаф'ева, керамічныя кампазіцыі, гравюры, аўталітаграфіі.

Перамога сапраўды яднала — на імпрэзе сабраліся прадстаўнікі розных узростаў, пакаленняў, прафесій, дзяржаў. Сустрэліся мастакі, якія на ўласныя вочы бачылі гэтыя падзеі, прапусцілі іх праз свае сэрцы, і тыя, хто нарадзіўся пасля вайны, ведае яе са слоў бацькоў, кніжак, фільмаў.

Са шчырымі словамі выступіла дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу РБ, Старшыня Фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі Наталля Аўдзеева:

— Дарагія нашы ветэраны, бацькі і маці, вялікі дзякуй вам за мір і жыццё, за тое, што мы маем магчымасць сёння не толькі існаваць, але і жыць прыгожа, з годнасцю. Апошнія гады мы найбольш востра адчулі, што мір крохкі, і трэба зрабіць усё магчымае, каб зберагчы яго. І вось гэтая выстава — адна з форм нашага разумення адзін аднаго, нашага супрацоўніцтва і барацьбы за мір. Праз творы мастацтва, напэўна, найбольш даходліва маладое пакаленне адчувае і ўспрымае, што такое вайна, фашызм, тэрарызм...

На адкрыцці выставы "Перамога, якая нас яднае" адбылася таксама прэзентацыя электроннага выдання "Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне (1941—1945)". CD-ROM, падрыхтаваны бібліятэкай, будзе цікавы не толькі для грамадзян Беларусі, але і іншых краін, тым больш што інфармацыя ў ім змешчана на беларускай, рускай і замежных мовах.

Айна БЯЛОВА

Непадалёк ад Баранавіч ёсць невялічкая вёсачка Бараўцы. Звычайная, якіх тысячы ў Беларусі, з некідкай прыродай, вірлівай рачулкай Мышанкай за ваколіцай, азярцом, парослым трыснягом. Але вядомая яна тым, што тут, у Бараўцах (тады Наваградскі павет Мінскай губерні), шостага ліпеня 1909 года нарадзіўся Сяргей Грыцавец — лётчык, першы двойчы Герой Савецкага Саюза (званні прысвоены ў лютым і жніўні 1939г.).

Апошні палёт нябеснага сокала

У 1932 годзе Сяргей Іванавіч закончыў Арэнбургскую ваенную школу лётчыкаў, а ў 1936-м — школу паветранага бою. Лётчык-знішчальнік, камандзір авіяцыйных звяна, атрада, знішчальнага палка. Удзельнічаў у баях у Іспаніі (1936 — 1939 гады). Ас паветранага бою: збіў трыццаць фашысцкіх самалётаў, у тым ліку сем за адзін дзень. За выкананне спецыяльнага ўрадавага задання старшаму лейтэнанту Грыцаўцу было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Затым ваяваў на рацэ Халхін-Гол. Тут таксама праявіў мужнасць і адвагу, збіўшы дванаццаць баявых машын ворага. У час аднаго з баёў загарэўся падбіты самалёт камандзіра злучэння. З парашутам ён выкінуўся і папаў на тэрыторыю ворага. Усё гэта ўбачыў Грыцавец і прызямліўся побач з камандзірам. Узяў яго ў свой аднамесны самалёт і на вачах у праціўніка ўзняўся ў паветра. За гэты геройскі ўчынак і адвагу Грыцаўцу было прысвоена другі раз званне Героя Савецкага Саюза.

Загінуў Сяргей Грыцавец 16 верасня 1939 года ў авіякатастрофе каля вёскі Балбасава Аршанскага раёна. У Баранавічах, вёсцы Моўчадзь Баранавіцкага раёна, а таксама ў Балбасаве яму пастаўлены помнікі. Яго імя носяць вуліцы Баранавічаў, Мінска, Оршы, Санкт-Пецярбурга, Масквы...

У Беларусі не засталося блізкіх сваякоў Сяргея Грыцаўца, але ў Баранавічах жыве яго стрыечны пляменнік Міхаіл Грыцавец. З Міхаілам Аляксандравічам мы сустрэліся ў гарадской стаматалагічнай паліклініцы, дзе ён ужо дваццаць пяць гадоў працуе галоўным урачом.

— Я нарадзіўся пасля смерці майго знакамітага родзіча. Таму пра яго ведаю толькі з успамінаў блізкіх. Мой бацька і Сяргей Іванавіч — стрыечныя браты, — расказвае ён. — Да чацвёртага класа хадзілі ў адну школу. Праўда, школай яе можна назваць толькі ўмоўна — клас у вясковай хаце. А вучыў іх бацька Сяргея — Іван Антонавіч Грыцавец. Чалавек па тым часе адукаваны — закончыў гімназію.

Мой тата памёр, але захаваліся яго запісы пра сумесную з Сяргеем вучобу, дзяцінства. Як успамінаў бацька, Сяргей быў мэтанакіраваны, смелы, нават крыху запальчывы юнак, у спрэчках заўсёды імкнуўся атрымаць верх. Дарэчы, у радзіне Грыцаўцоў усе такія. Напрыклад, нашага дзядзьку Косцю, вельмі "гарачага" чалавека, землякі называлі "ўхач".

— Сяргей Грыцавец закончыў лётную школу ў Арэнбургу. Цікава, а як ён туды патрапіў, бо тым часам Заходняя Беларусь уваходзіла ў склад панскай Польшчы?

— Пачну з таго, што кнігі, даследаванні пра Грыцаўца ў многім, так бы мовіць, прыгладжаныя, замоўчваюць некаторыя моманты яго біяграфіі і жыцця сям'і.

У 1914 годзе сям'ю Грыцаўцоў, калі наступалі кайзераўскія войскі, эвакуіравалі на Усход. Дзеці і дарослыя трапілі ў Чэлябінскую вобласць, у станіцу Сасноўка. Працавалі на багатых казакоў. Калі пачалася грамадзянская вайна, казацтва падзялілася на два варагуючых лагеры. Неразбярыха, страляніна, голад.

У 1920 годзе сям'я Грыцаўцоў вярнулася на радзіму. Але ў дарозе Сяргей і яго сястра Жэня згубіліся. Як стала вядома значна пазней, брат і сястра выхоўваліся ў дзіцячым доме. Сяргей закончыў рэальнае вучылішча, працаваў на заводзе, наведваў аэраклуб.

— Ці застаўся хто ў жывых з блізкай радні героя — жонка, дзеці, сёстры?..

— Жонка Галіна памерла ў 1942 годзе ў эвакуацыі ў горадзе Фрунзе. Дочкі Ніна і Ларыса трапілі ў дзіцячы дом. Пасля вайны іх адшукала бабуля. Разам з унучкамі яна пераехала ў Маскву, дзе ім выдзелілі асобную кватэру ў цэнтры горада. На жаль, малодшая Ніна заўчасна памерла. А Ларыса па-ранейшаму жыве ў расійскай сталіцы. Некалі яна часта прыязджала на радзіму бацькі. Дарэчы, апошнім разам яна сказала, што яе перасялілі ў кватэру меншай плошчы, далей ад цэнтра.

Калі загінуў бацька, Ларысе было два гады. Але яна пайшла па яго слядах, закончыла авіяцыйны інстытут.

У Маскве пражывае і сын Грыцаўца — Сяргей.

— Што ў вашым жыцці, Міхаіл Аляксандравіч, значыць вуліца імя вашага дзядзькі?

— Перш за ўсё, выклікае гонар за прозвішча, якое нашу, за радню, якая дала краіне такога славутага чалавека.

— Калі шчыра, хоць аднойчы давялося выкарыстаць прозвішча знакамітага родзіча ў асабістых мэтах?

— Я ніколі не акцэнтаваў увагу, што з'яўляюся сваяком Сяргея Грыцаўца. Дарогу ў жыцці прабіваў сам: закончыў зубаўрачэбнае вучылішча, працаваў у вёсцы, служыў у арміі. Затым — медінстытут. Як малады спецыяліст, атрымаў кватэру, дзе і жывём з жонкай да гэтага часу. Дзеці нашы выраслі, разляцеліся з роднага гнязда. Сын прадоўжыў маю справу — таксама медык, а дачка пайшла працаваць па фінансавай справе.

А вось наша цётка Марыя (смяецца) аднойчы скарыстала вядомае прозвішча. Недзе на пачатку пяцідзесятых гадоў згарэла ў яе хата. Напярэдадні Вялікадня паставіла яна пекчыся пірагі ў печку і пайшла ў царкву. Вярнулася ўжо на папялішча. У страхоўцы ёй мясцовыя ўлады адмовілі, маўляў, пажар адбыўся, калі гаспадыня "адпраўляла рэлігійны культ".

Але наша цётка была кабета баявая, настырная, паехала па праўду ў Маскву. Брат Іван, які там жыў, параіў ёй звярнуцца ў Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР.

Доўга прасядзела Марыя ў прыёмнай. А калі рабочы дзень заканчваўся, выйшла сакратарка і сказала, што наша цётачка можа ехаць дамоў, яе пытанне будзе вырашана. І тут жанчына раззлавалася не на жарт: "Ты, з намаляванымі пазногцямі, вярзеш абы-што. Мяне ж нават у кабінет не паклікалі," — і мацюкнулася на беларуска-польскім дыялекце. Ды так, што сакратарка, упершыню пачуўшы такое, зайшлася ад смеху.

Але цётка Марыя дачакалася-такі, пакуль выйдзе сам Швернік — на той час Старшыня Прэзідыума. І пакінула прыёмную толькі тады, калі ён супакоіў, што страхоўка будзе выплачана. Дзядзька Іван пасля доўга жартаваў, што сварлівых сваякоў з Бараўцоў нельга пускаць у сталіцу.

Пасля прыезду дамоў грошы наша сваячка атрымала. Але акрамя гэтага запатрабавала, каб "аплацілі" і кажушок, які хавала на гарышчы ад цыганоў і які "прапаў" разам з хатай.

— Ваш дзядзька Сяргей Іванавіч, на маю думку, мог бы стаць і тройчы Героем Савецкага Саюза, калі б дажыў да Вялікай Айчыннай...

— Не выключаю, магло стацца, што так. Гэта быў смелы, адчайны чалавек, сапраўдны патрыёт сваёй Радзімы, ас лётнай справы.

У 1972 годзе, калі я быў на курсах у Ленінградскім медінстытуце, пазнаёміўся з палкоўнікам Фіялкоўскім, які ў час баёў на Халхін-Голе служыў начальнікам лазарэта. Ён добра ведаў Сяргея Грыцаўца. Многа расказаў пра яго і ягоных саслужыўцаў.

Напрыклад, па яго словах, у самым пачатку баявых дзеянняў байцам Чырвонай Арміі не было ніякага перадыху ад японскіх лётчыкаў, якія бесперапынна бамбілі нашы пазіцыі. Цішыня настала, калі на Халхін-Гол перакінулі лётчыкаў-знішчальнікаў, якія ваявалі ў Іспаніі, мелі баявы вопыт. Літаральна праз тыдзень яны расчысцілі неба ад японскіх самалётаў. І зусім невыпадкова, а заслужана, у тыя часы лётчыкаў-знішчальнікаў называлі ў народзе "сталінскімі сокаламі".

— Гібель Сяргея Грыцаўца — трагічная выпадковасць? Што гаварылі з гэтай нагоды ў вашай сям"і?

— Наша радня сумнявалася ў вывадах афіцыйнай камісіі, якая расследавала справу. Пагаворвалі, што, магчыма, за гэтай гібеллю стаяць нейкія палітычныя інтрыгі. Ніхто з родных не верыў, што маёр Хара, вопытны баявы лётчык, які ваяваў у Іспаніі, калі прызямляўся, мог зачапіць крылом самалёт Грыцаўца. Магчыма, гэта аварыя была спланавана. Пасля вайны бацька Сяргея, наш дзядуля, звяртаўся ў "Звязду" (не ведаю, праўда, чаму менавіта ў газету) з просьбай разабрацца ў гібелі сына. Праз нейкі час ён атрымаў тактоўны адказ за подпісам тагачаснага галоўнага рэдактара выдання, маўляў, гэта справа кампетэнтных органаў... Інакш, намёк: не лезь, куды не трэба. Сапраўды, вы ж ведаеце, што за лішнія пытанні ў тыя часы можна было паплаціцца воляй, а то і жыццём.

В. КАВАЛЁЎ

Фота забяспечана аўтарам

Традыцыйныя сустрэчы

У музеі Якуба Коласа прайшоў традыцыйны "чацвер". Ён быў прысвечаны прэзентацыі чарговай кнігі вершаў "Голас і рэха" беларускага паэта, вядучага аўтарскай праграмы на першым нацыянальным канале радыё "Зямля, што нам дадзена лёсам" Навума Гальпяровіча.

Вечар быў праведзены ў форме гутаркі-інтэрв'ю, у якой прымаў удзел намеснік галоўнага рэдактара часопіса "Маладосць" паэт Алесь Бадак.

Навум Гальпяровіч коратка распавёў прысутным на вечарыне пра гісторыю стварэння свайго паэтычнага зборніка. Пра выданне аўтар думаў яшчэ напрыканцы 90-х гадоў, калі жыў і працаваў у Наваполацку. Напісаны ў свой час верш "Голас і рэха" навёў аўтара на думку аб стварэнні зборніка з новых твораў і вершаў. Беларускі мастак, заснавальнік, пазней дырэктар галерэі "Рыса" ў Полацку Сяргей Цімохаў намаляваў і падарыў Гальпяровічу вокладку будучай кнігі.

Ужо ў Мінску ў Н. Гальпяровіча выйшлі зборнікі "Шляхі і вяртанні", "Святло ў акне", а думка выдаць гэты зборнік усё прымала больш акрэсленыя формы і змест.

І вось выдавецтва "Чатыры чвэрці" і рэдактар гэтай кнігі Ліліяна Анцух падтрымалі ідэю. Гэты невялікі зборнік лірычных вершаў, адзначыў Н. Гальпяровіч, аб'яднаў вершы розных гадоў не па прынцыпе іх значнасці ці таленавітасці. Вершы знітаваны нябачнай мелодыяй, блізкай і зразумелай самому паэту і чытачу: Каханне і Любоў, Шчырасць і Справядлівасць, Голас і Рэха, Душа і Вера, якая памыляецца і верыць, любіць і пакутуе. Гэта — надзея на светлае і прыгожае, на будучыя сустрэчы і ўзаемаразуменне.

У гутарку-інтэрв'ю ўдала ўпляліся выступленні рэдактара кнігі Л. Анцух, загадчыка аддзела культуры Стаўбцоўскага райвыканкама А. Грэкава.

На імпрэзе прысутнічалі студэнты Інстытута кіравання ў Мінску, пісьменнікі Іван Курбека, Уладзімір Содаль, Алесь Савіцкі, галоўны рэдактар часопіса "Роднае слова" Міхась Шавыркін, шматлікія госці ўтульнага дома Якуба Коласа. З новымі беларускімі песнямі прысутных пазнаёмілі дзяўчаты-прыгажуні з квартэта "Святлана".

Анатоль ВАЛАХАНОВІЧ

Мікалай ЧАРГІНЕЦ: «На карысць суграмадзян, у імя літаратуры»

Працоўны дзень старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Мікалая Чаргінца распісаны калі не па хвілінах, то да чвэрці гадзіны — адназначна! Тых, хто ідзе ў ягоны кабінет з дзяржаўнай справай ці ўласнай бядой, здаецца, не злічыць. Што, дарэчы, і не здзіўляе. Наўрад ці каму ў краіне яшчэ невядомае прозвішча гэтага папулярнага пісьменніка, палітыка, генерал-лейтэнанта .
Таму наша гутарка проста не магла распачацца з якога-небудзь іншага пытання.

Рыса характару

— Мікалай Іванавіч, вас так многа, але ж вы — адзін. Як на ўсё хапае — свайго часу і ... самога сябе?

— Што датычыць шматграннасці маіх заняткаў, то гэта ўвогуле — рыса характару. Маленькая дэталь: я ніколі не працую над адной кнігай. Звычайна ў рабоце — тры, чатыры, а то і пяць рукапісаў. Пішу — і раптам адчуваю псіхалагічную стомленасць. Пераключаюся на іншую тэму, якая мне на гэты момант бліжэй. І адчуваю, што мне лягчэй працаваць менавіта такім чынам.

Ведаеце, я неяк паспрабаваў падлічыць тую колькасць рознага кшталту арганізацый, у склад кіраўніцтва якіх маю гонар — ці службовы абавязак — уваходзіць. Аказалася, ні больш — ні менш як 49! Відаць, так лёсам наканавана. Ну вось, да прыкладу, ніхто не прымушаў мяне рабіць на тэлебачанні перадачы аб пісьменніках-франтавіках. Але я займаюся гэтым. Бо разумею: людзям ужо за восемдзесят, а камусьці і дзевяноста. І пішуць яны не толькі, а можа, і не столькі пра вайну. У першую чаргу, гэта скарбніца ведаў, вопыту, мудрасці. І няхай нават штосьці не вельмі ўдасца такому пісьменніку — усё роўна прынясе карысць чытачу. Адыходзяць з жыцця нашыя франтавікі, дык давайце замацуем у памяці іх творы, угледзімся ў твары, захаваем партрэты...

Я паставіў сабе мэту паказаць максімальную колькасць літаратараў ваеннага пакалення — а іх цяпер 37. На жаль, некаторыя ўжо і інтэрв'ю даць не ў стане. Таму нам трэба спяшацца. Сыходзячы з таго, што не кожны зразумее задумку праекта, прапанаваў сваё аўтарства па ўсіх напрамках: сам вяду праграму, сам над сцэнарыем працую, на здымкі з брыгадай выязджаю. Тым больш што вопыт работы на тэлебачанні маецца.

Але ёсць і адваротны бок медаля — элементарная зайздрасць...

— Мабыць, з-за гэтага вы адмовіліся ад ганараў?

— Хачу, каб мяне разумелі правільна: я займаюся гэтай справай таму, што лічу яе надзвычай патрэбнай нашаму грамадству.

— Што тут скажаш? Быць настолькі вядомай асобай і не мець пры гэтым зайздроснікаў — неяк нерэальна. Наколькі я ведаю, ляцелі "камяні" ў ваш бок і з нагоды нядаўняга выхаду на экраны кінафільма "Вам — заданне"...

— Было такое... А зусім нядаўна давялося пабываць у Белгарадзе. Там людзі ўбачылі экранізацыю гэтага рамана. Я падняўся на сцэну і ўбачыў, як са слязьмі на вачах сядзяць у кіназале не толькі састарэлыя гледачы, але і моладзь. Ведаеце, так за сэрца кранула! Хоць асабіста я, шчыра кажучы, фільмам незадаволены. Праўда, пачуццё незадаволенасці мяне заўсёды па жыцці суправаджае. І ўсё ж... Дваццаць гадоў я не даваў згоды на экранізацыю рамана. Бо быў перакананы: добры фільм можа атрымацца толькі пры ўмове, што ён будзе шматсерыйным. Магчыма, мы атрымалі б "Семнаццаць імгненняў вясны" ў беларускім варыянце. Змаглі б "захапіць" моладзь, зарыентаваць яе на тое, чаму вучаць героі гэтага твора. Матэрыялу дастаткова: там і каханне, і здрада, і вайна, і пасляваенны час...

Але атрымалася так, як атрымалася. Тым больш прыемна чуць добрыя водгукі на фільм ад многіх сяброў, калег, радавога гледача. Ды што пра мяне? Яшчэ не паспелі зняць фільм па Івану Шамякіну, як знайшоўся адзін літаратурны дзеяч, прычым не з апазіцыйных радоў, які пачаў ахайваць, што называецца, усё і ўся. На жаль, з'явілася ў нас плеяда, хоць і нешматлікая, такіх "палівалаў"-літаратараў, якія заўважаюць штосьці добрае і карыснае толькі тады, калі заўважаны, ці — яшчэ лепей — адзначаны іх уласныя творы. Ну што ж, няхай гэта застаецца на іх сумленні.

Хобі? Максімум падзей

— Ваша грамадзянская пазіцыя зразумелая. Каб адстойваць яе, патрэбна шмат сіл. Патрэбны яны і для занятку творчасцю, і для палітычных боек, без якіх, дарэчы, не абыходзіцца ваша парламенцкая і міжпарламенцкая дзейнасць. Дзе "куюцца" гэтыя сілы?

— У сям'і. Мне вельмі пашанцавала з жонкай, якая сціпла і неназаляючы стварае ўмовы і для службы, і для творчасці. Яе прыкладам кіруюцца і дзеці. Ва ўсякім разе, яны стараюцца не прычыняць мне болю. Таму я пазбаўлены ад сямейных істэрык, якія могуць выклікаць сустрэчную рэакцыю.

Ды і ўвогуле — мы, мужчыны, любім пабыць ляніўцамі. Ва ўсякім разе, па сабе мяркую. Дык вось, калі бачыш, што дома ўсё зроблена: чыста, акуратна, цёпла, і каб не перашкаджаць табе глядзець тэлевізар, дзеці адзін на аднаго шушукаюць — чаго яшчэ жадаць?

Гэта што датычыць спрыяльных умоў для працы ўвогуле. А для творчай думкі асабіста для мяне вельмі карыснымі аказваюцца ... раздражняльнікі: тыя ж самыя міжнародныя сустрэчы, паездкі, палітычныя бойкі. Усё ж гэта бударажыць у чалавека творчага пэўныя эмоцыі, якія ў сваю чаргу нараджаюць ідэі і думкі. Напрыклад, раман "Тайна авальнага кабінета" — сапраўднае дзіця міжнародных падзей. Думаю, там дастаткова лёгка пазнаць у галоўным героі Клінтана, яго Моніку... Вось такім чынам спрацоўвае напружанне, якое я адчуваю пры выкананні сваіх непасрэдных службовых абавязкаў.

— Гэта ў вас такое хобі — адукацца па жыцці на максімум падзей?

— Я б сказаў, воля лёсу... Так склалася, да прыкладу, што большасць людзей ідуць на прыём у мой кабінет. І дзевяноста працэнтаў з іх — зусім не па тых пытаннях, якімі мне даводзіцца займацца. Я разумею: чалавек ідзе "на Чаргінца". Ну як мне сказаць яму пры гэтым: паважаны, гэта не мая праблема — схадзі да каго-небудзь іншага... Можа, хтосьці так і зрабіў бы, можа, так было б правільна. Але асабіста я — не магу! Што ў выніку? Пішу, скажам, у патрэбнае міністэрства, там бачаць — "не ягоная справа". І хоць адзін яго супрацоўнік абавязкова падумае: ага, штосьці Чаргінец з гэтага мае! Зразумейце мяне правільна: проста я з павагай стаўлюся да чалавека. Тым больш, калі ён мае рацыю. А калі не — прашу, каб растлумачылі яму гэта прафесіяналы.

Заўсёды сардэчна рады, калі ўдаецца літаральна выратаваць майго наведвальніка ад дапушчанай адносна яго несправядлівасці. Няхай для гэтага прыходзіцца хоць пяць разоў пісаць у розныя — высокія і не вельмі — інстанцыі. Давялося, напрыклад, паваяваць за інтарэсы састарэлай сямейнай пары з Салігорска, якая страціла свайго сына ў Афганістане. Несправядлівыя, нават незаконныя дзеянні ў дачыненні да іх дапусціў супрацоўнік міліцыі — участковы інспектар. Яго падтрымалі, толкам не разабраўшыся, больш высокія інстанцыі, у тым ліку пракуратура.. І — пайшла працаваць чыноўніцкая машына... Прыйшлося прыпыніць. У выніку вінаватыя панеслі пакаранне. А я, паверце, быў шчаслівы не менш, чым бок пакрыўджаны.

Праўда, здараюцца гісторыі і іншага парадку. Ад чужой нахабнасці не застрахуешся. Неяк прыехала да мяне жанчына з Маладзечна і літаральна патрабуе: трэба пакараць супрацоўнікаў міліцыі, пракуратуры, суда — маўляў, сына нізашто пасадзілі. Пачаў разбірацца. Аказалася — за наркотыкі. Дакладней, за іх распаўсюджванне. Паспрабаваў растлумачыць, ды дзе там! Вось так чалавек хацеў скарыстаць маё імя, маю прыхільнасць да людзей... Гэта вельмі непрыемна.

Тыл для літаратараў

— Мікалай Іванавіч, ці даводзіцца вам абараняць інтарэсы калег па пяру? Гэта лагічна, калі прыгадаць яшчэ адну вашу пасаду — старшыня Літфонду? Дарэчы, у савецкіх кінафільмах і мастацкіх творах вядомыя, у той ці іншай ступені, літаратары паўстаюць перад намі ... скажам так, аблашчанымі дзяржавай людзьмі. А сёння Літфонд, як магчымы тыл, у стане справіцца са сваімі абавязкамі?

— Літфонд надзелены тымі ж паўнамоцтвамі, што і Саюз пісьменнікаў, толькі ў яго яшчэ ёсць права і абавязак аказваць дапамогу пісьменнікам у вырашэнні іх праблем. Канечне, раней, у быт насць Саюза, калі быў адзіны, вялікі, і наш, маленькі Літфонд, выдзяляліся мэтавыя дзяржаўныя сродкі. Аднак дваістыя пачуцці ахопліваюць мяне пры гэтым: памятаю, як многія мае калегі грамілі тагачасныя парадкі і патрабавалі ... капіталізм. Дык ім жа не прадугледжана сістэма найбольшай спрыяльнасці для пісьменнікаў. У тым ліку і матэрыяльнай. Тут іншы, зусім не савецкі, падыход: вось вам вуда, а рыбу ўжо самі, калі ласка, лавіце.

— Што вы маеце на ўвазе?

—Зараз зусім іншая абстаноўка, іншыя патрабаванні, найпершае з якіх — самаакупнасць. Хочаш друкавацца — шукай спонсараў, знаходзь грошы, потым прадавай — і табе ў гэтым дапамогуць, выручку забірай і выкарыстоўвай на выданне іншага твора. А мы, пісьменнікі, аказаліся да гэтага непадрыхтаванымі. Некаторыя кінуліся ў апазіцыю. Сітуацыя складваецца парадаксальная. І гэта мякка кажучы. З аднаго боку, патрабуюць ад улады спрыяльных умоў для сябе і сваіх твораў: маўляў, я — пісьменнік, з другога — крычаць гэтай уладзе "Прэч!" Такое ўражанне, што людзі не могуць вызначыць, чаго хочуць. Няхай мяне выбачаюць за параўнанне, але — зусім як у адной забаўнай гісторыі: двое сядзяць у акопах і страляюць адзін у аднаго. У кагосьці скончыліся патроны, і ён крычыць праціўніку: "Іван! Пазыч патроны, а то забіць цябе няма чым..."

Але дзяржаўным органам таксама трэба разумець, што ў краіне не можа не быць пісьменнікаў. І больш актыўна супрацоўнічаць, прынамсі, з тымі, хто лаяльны да ўлады і жадае разам працаваць на карысць сваіх суграмадзян, у імя літаратуры. А праз іх рады пераконваць у сваёй праваце, даводзіць дзяржаўную пазіцыю да некаторых літаратараў, якія дзеля супраціўлення ўладам памянялі "пяро на штык" .

Ці ж гэта не павінна быць важным складнікам у рабоце дзеючай сістэмы дзяржаўнай ідэалогіі?

— Што датычыць клопатаў Літфонду...

— Мы робім усё рэальна магчымае. Правялі вось сустрэчу з пісьменнікамі-франтавікамі, уручылі ім падарункі, узнагароды. Дзякуючы падтрымцы Прэзідэнта краіны, міністра абароны. Але, па вялікім рахунку, Літфонду патрэбны фонды, якія далі б магчымасць дапамагаць пісьменнікам. Не прамаўчу: ёсць у мяне заявы ад калег з самымі рознымі просьбамі. І мы, канечне, маглі б развярнуцца. Таму, лічу, дзяржаве варта было б падумаць аб больш узважаным падыходзе да справы падтрымкі пісьменнікаў. Я, напрыклад, цалкам згодны з Прэзідэнтам у тым, што ён змагаецца за здароўе нацыі праз спорт, будаўніцтва аздараўленчых цэнтраў, баз адпачынку... І Літфонду патрэбна ... не, не палац — бясплатнае памяшканне, дзе маглі б збірацца пісьменнікі. Зразумела, пры ўмове, што ніхто не будзе займацца там бруднай палітыкай.

Мы маем распараджэнне Прэзідэнта Міністэрству адукацыі наконт выдання падручнікаў на беларускай мове праз Літфонд. І што? Ды нічога: не выконваецца. Я неаднаразова звяртаўся да кіраўніцтва Мінадукацыі. Безвынікова. Як гэта трэба расцэньваць? На мой погляд, як палітычную недальнабачнасць.

Аднак крытыка ў адрас аднаго міністэрства не павінна перакрэсліць усё, што робіцца ў гэтым напрамку дзяржавай. Вось толькі адзін факт: за рускамоўныя кнігі, у адрозненне ад беларускамоўных, выдавецтвы не атрымліваюць датацый. Так Прэзідэнт запатрабаваў. Менавіта па ініцыятыве кіраўніка дзяржавы шыльды з назвамі вуліц у нашых гарадах сталі выключна беларускамоўнымі. Яшчэ сказана, што павінна павялічвацца колькасць беларускіх выданняў, пашырацца працэс выкладання на беларускай мове. Чамусьці ўпарта не заўважаюць гэтага некаторыя змагары за родную мову, для якіх яе ўваходжанне ў паўсядзённасць — што... выключальнік: націснуў — і ўсе загавораць па-беларуску. А самі? Напісаць кнігу — гэта далёка не ўсё. Трэба яшчэ і ў дзіцячым садку, у школе з дзецьмі сустрэцца, на роднай мове з імі паразмаўляць. Там, лічу, трэба пачынаць абараняць яе. Дарэчы, нам усім...

Гутарыла Інеса ПЕТРУСЕВІЧ
Фота К. ДРОБАВА

Багатая душа

Некалі на пытанне, хто такія барды, Булат Акуджава даў адназначны адказ: "...паэты, якія спяваюць свае вершы". Але навошта? Чаму б ім не быць паасобку: паэты няхай пішуць вершы, а спевакі выходзяць на сцэну? Акуджава і тут працягвае сваю думку: "...паэзія пад акампанемент стала супрацьвагою забаўляльнай эстраднай песні, бездухоўнаму мастацтву, імітацыі пачуццяў. Яна пісалася разумнымі людзьмі для разумных людзей."

Некалі ў застойныя савецкія часы бардаўскі рух набыў агульнасаюзныя маштабы, зрабіўся альтэрнатывай афіцыйнаму саўковаму мастацтву. Менавіта дзякуючы магнітафонным запісам тэксты А.Галіча, Ул.Высоцкага, Ю.Кіма і нават І.Бродскага (у выкананні іншых аўтараў) распаўсюджваліся з велізарнай хуткасцю.

Сёння на Беларусі Алесь Камоцкі — бадай, самы яркі прадстаўнік бардаўскай плыні. Ягоныя выступленні ўжо шмат гадоў карыстаюцца папулярнасцю ў колах прыхільнікаў беларускай аўтарскай песні. А ў мінулым годзе ён зрабіў ім шыкоўны падарунак —у выдавецтве "Радыёла-плюс" выдаў кнігу вершаў. Кішэннага фармату, прыгожа афармленая, з адмысловымі фотаўстаўкамі, аб'ёмам каля двухсот пяцідзесяці старонак, — словам, кніга, якую проста прыемна ўзяць у рукі. Змест, у параўнанні са шматлікімі іншымі "паэтычнымі" выданнямі, адпавядае афармленню. На вокладцы — ненавязлівы фотаздымак, пейзаж з валунамі, тыповы для беларускай прыроды. І назва — "Неспадзяванае". Кніга і сапраўды, нагадвае збор вершаў-неспадзяванак, якія аднойчы здарыліся, запісаліся, каб пасля быць аб'яднанымі пад адной вокладкай.

Зборнік складаецца з трох раздзелаў: "Спроба ісці па расе", "Вечарамі шуканае" і "Песні". Раздзелы неаднародныя і аб'яднаныя адметным аўтарскім светаадчуваннем, спосабам мыслення. Змест першых двух з іх нагадвае выпадковыя зацемкі, якія ўзніклі дзякуючы нейкім згадкам ці асацыяцыям, дзе-нідзе яны нават прэтэндуюць на афарыстычнасць ("Я трымаў сваё шчасце ў руках // І баяўся ў кішэню пакласці, // Бо тады не было б ужо шчасцем // Тое, што я трымаў у руках."). Аб гэтым сведчаць нават падзагалоўкі ўнутры саміх раздзелаў: "Суадносіны", "Табун", "Струны", "Знешняе", "Дадаткі", "Пыркі" і інш.

Кніга Алеся Камоцкага — гэта споведзь адзінокай душы, якая стамілася ад штодзённых мітрэнгаў і шукае паратунку ў Слове.

Быццё ў ягоных вершах — не нейкая канстанта, яно зменлівае, як, зрэшты, і сам чалавек:

Што калісьці было пакутай —
Таго проста ўжо няма.

Нястомныя духоўныя пошукі яскрава прасочваюцца ў наступных радках аўтара:

Куды дзяецца сьлед
ад зоркі,
што ўпала,
Ад вогнішча,
што згасла.
Ад казкі,
што была?

Шляхам адчайнага роздуму высноўваецца наступнае аўтарскае крэда: "І кожны крок — апошні крок...". Пранікнёны лірык на сцэне, здольны ўсталяваць непасрэдны кантакт з любой аўдыторыяй, Алесь Камоцкі ў сваіх вершах выступае ў першую чаргу ў іпастасі філосафа і крыху скептыка, захоўваючы, тым не менш, імідж "прыкаліста". Дастаткова толькі працытаваць адметную ў неадназначнасці параўнання карацельку:

Самотна дыхаю сусьветам
Сярод сваіх бясконцых мар
Жыццё ідзець так непрыкметна,
Як муха гадзіць на ліхтар.

Не памылюся, калі назаву паэзію Алеся Камоцкага своеасаблівай, разлічанай, у першую чаргу, на прыхільнікаў яго музычнай творчасці. Песенныя тэксты, змешчаныя ў апошнім раздзеле кнігі, якраз і вылучаюцца гэтай своеасаблівасцю — лірычным роздумам, нечаканымі паваротамі думкі, унутранай меладычнасцю. Як і шмат якім тэкстам песень увогуле, часам ім не хапае насычанасці і глыбіні, часам вобраз прыносіцца ў ахвяру прыгожаму радку. Але, відаць, аўтар і сам не прэтэндуе на званне класіка айчыннай паэзіі (варта адзначыць, што зборнік выйшаў тыражом усяго 100 асобнікаў).

Старэйшы сябра барда, народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін у сваім вершы-пасляслоўі да зборніка дае яму наступную характарыстыку:

А багатая душа не скупая
Ні на шчырасьць,
Ні на неспакой...

Насамрэч, толькі багатая душа здольная весці адухоўленае, пачуццёва насычанае жыццё, якое дае сапраўдны, а не ўяўны плён.

Янка ЛАЙКОЎ

Нялёгкі хлеб

Вядомае выказванне, што смеху баіцца той, каго ўжо нічога не палохае. Нездарма папулярным застаецца выслоўе наменклатурных, прыўладных колаў: "Нам нужны Салтыковы-Щедрины и такие Гоголи, чтобы нас не трогали". Так і вядзецца...

Скрозь не любяць, калі праўдзівае, трапнае слова пападае не ў брыво, а прама ў вока. У сваю абарону і жукі, і жабы верашчаць: нагавор, абраза.

Так што ў праўдашукальнікаў хлеб нялёгкі. Горкі хлеб. Ім як нікому патрэбен байцоўскі характар і здольнасць не саступіць. Як цяжка ваяваць за праўду, ведаюць многія.

Беларускаму сатырыку Міколу Вяршыніну споўнілася 65 гадоў. Ён выдаў дванаццаць кніг. Апошняя з іх — выбранае — выйшла ў канцы 2003 года пад назвай "Дакрытыкаваўся".

Беларуская сатыра мае глыбокія карані. Ад ананімных паэм, творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Кандрата Крапівы, Э. Валасевіча, М. Аўрамчыка, М. Яўсеева і іншых, да юбіляра Міколы Вяршыніна, які чуйна адгукаецца на ўсе з'явы жыцця.

Вось пра што ён піша ў вострай і надзённай байцы "Бык ва ўладзе":

Каго люблю і з кім сябрую,
Я тым усе грахі дарую.
Нялюбых жа сатру з дарогі,
Бо маю капыты і рогі.

Або ў байцы "Асёл і навука":

Што ж можна пра Асла
сказаць?
Што ўсё заўважыць
могуць самі:
Дзе трэба розумам узяць,
Ён толькі варухне вушамі.

Думаецца, на доўгія часы надзённым застанецца і такое назіранне сатырыка: гультай-гультаём, але — падхалім адчайны. І ў большай пашане, чым нейкі перадавік:

Для тых,
хто хоча жыць зручней,
Заўжды, як правіла, важней —
Не працаваць больш, ды цяжэй,
А да начальства быць бліжэй.

Вось так паэт і капае пад розных нягоднікаў і прайдзісветаў.

Упэўнены, нідзе нікім калючыя ружы не былі і не будуць пастрыжаны. Хопіць іх, Мікола, і на твой век. Поспехаў табе! І новых цікавых кніг.

Уладзімір ПАЎЛАЎ

Сустрэча праз гады

Пачатак шасцідзесятых... Мінулага, вядома ж, стагоддзя. Ужо добра-такі адчуваецца цяпло так званай "хрушчоўскай адлігі", але свежы вецер перамен яшчэ адчувальны мала. А мы, маладыя студэнты-філфакаўцы, ловім кожны подых новых павеваў, з прагнасцю адкрываем для сябе новыя імёны творцаў, з якімі потым будзем ісці па жыцці, а, пішучы нешта сваё, раўняцца на іх. Драматург Іван Козел — ці не адно з тых імён. Пра яго п'есу "Папараць-кветка" шмат пісала ў ранейшыя часы наша прэса. Пасля заняткаў мы беглі ў Тэатр юнага гледача, каб паглядзець сам спектакль. Балазе наш факультэт знаходзіўся побач з тэатрам, на вуліцы Чырвонаармейскай.

Маладыя і чытачы, і гледачы заўсёды прыдзірлівыя. Мы шукалі ў п'есе пачынаючага драматурга нейкія слабыя месцы і нават знаходзілі іх. Падзеі ў творы, як вядома, разгортваюцца ва ўмовах былой Заходняй Беларусі. Крыху "лёгкай", нібы "прывязанай", здавалася нам сама канцоўка "Папараць-кветкі". Але так завяршалася большасць тагачасных твораў. Грамадскасць п'есу новага аўтара ацаніла высока. У 1958 годзе на Усесаюзным фестывалі тэатраў у Маскве спектакль, пастаўлены паводле яе, атрымаў дыплом першай ступені. Больш як дзесяць гадоў ён не сыходзіў са сцэны, меў поспех у гледача.

Цёплы водгук крытыкі атрымала і другая п'еса драматурга "Над хвалямі Серабранкі", якую надрукаваў часопіс "Маладосць" у 1961 годзе (№ 9) пад назвай "Канчане — суседзі мае".

Для Тэатра юнага гледача Іван Козел стаўся сапраўды "сваім драматургам". Менавіта спектаклямі па яго творах адкрываўся на працягу многіх гадоў кожны новы сезон тэатра і ўсе яго гастролі.

Пісьменнік сапраўды шукаў у творчасці сваю запаветную папараць-кветку, але раптоўная смерць перапыніла назаўсёды гэтыя пошукі.

Больш як тры дзесяткі гадоў мінула з таго часу. Імя таленавітага і самабытнага драматурга рэдка згадвалася ў айчынным друку. За гэты час у літаратуру прыйшло нямала новых маладых творцаў, многім з іх зусім было невядома імя І. Козела. Творы пісьменніка не выдаваліся.

І вось нядаўна, дзякуючы намаганням Міхася Казлоўскага, у Маладзечне пабачыла свет кніга выбранага Івана Козела "Над хвалямі Серабранкі". Выданне выйшла дзякуючы фінансавай падтрымцы аддзела культуры Маладзечанскага райвыканкама, а таксама дапамозе супрацоўнікаў дзяржаўнага музея літаратуры і мастацтва і Маладзечанскай цэнтральнай раённай бібліятэкі. У гэты зборнік, які адкрываецца ўступным словам укладальніка М. Казлоўскага, увайшлі драматычныя творы пісьменніка: "Папараць-кветка", "Над хвалямі Серабранкі" і малавядомая чытачу тэатральная казка "Краіна фарбаў". Апошнюю, дарэчы, укладальнік адзначае як "самы лепшы драматургічны твор" з усяго напісанага Іванам Козелам.

Што зробіш, сам час змусіў нас глянуць на падзеі, якія апісваюцца ў творах драматурга, зусім іншымі вачыма. Многае сёння аказалася непрымальным. Але бясспрэчным застаецца адно: пісаў іх творца таленавіты, самабытны. Мова ў яго сакавітая і каларытная, вобразы — яркія, запамінальныя.

Кнігу "На хвалях Серабранкі" вельмі хораша дапаўняюць фотаздымкі з дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.

Іван Козел памёр у 1970 годзе, калі яму ішоў 42 год. Ён бы мог яшчэ шмат зрабіць для айчыннай драматургіі. На жаль, многае засталося толькі ў задумах. Але і тое, што паспеў стварыць таленавіты драматург, стала набыткам нашай літаратуры.

Казімір КАМЕЙША

Іван Козел. "Над хвалямі Серабранкі". П'есы.
Маладзечна РУП "Друкарня "Перамога". 2005.+

Невычарпальная ТЭМА

“Тэма вайны — пакуль яшчэ невычарпальная тэма”, — пісаў Міхась Стральцоў у 1976 годзе. Пераважная большасць публікацый майскіх часопісаў дае магчымасць яшчэ раз пераканацца, што гэтае меркаванне застаецца паранейшаму актуальным...

Полымя № 5

Паэзія Пятра Прыходзькі і Паўлюка Пранузы, непасрэдных удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, выконвае функцыю своеасаблівай візітоўкі нумара. Загартаваныя баямі радкі, многія з якіх датуюцца менавіта ваеннымі гадамі, выяўляюць драматычную глыбіню зведанага і перажытага паэтамі.

Вядома, што выключныя падзеі і з'явы, экстрэмальныя і трагічныя абставіны, нібы каталізатар, выяўляюць чалавечую сутнасць: як самае лепшае, годнае, так і глыбінна-пачварнае, раней замаскіраванае, стоенае. Аповесць “Душагуб” Васіля Шабалтаса дэманструе якраз гэтую з'яву — як мімікрыруе хцівы, амбітны і зласлівы чалавечык, ператвараючыся ў натуральнага вылюдка, калі дзеля гэтага выдаюцца спрыяльныя ўмовы.

Хроніка чатырох чалавечых лёсаў, з'яднаных у адно сяброўства, жыццёвае і творчае, занатавана ў аповедзе-ўспаміне Галіны Васілеўскай “Іх было чацвёра...” Усе яны прайшлі дарогамі вайны: “Васілеўскі і Шамякін ваявалі на Поўначы, на Карэльскім фронце, адзіны з сяброў не паранены Шамякін яшчэ вызваляў Польшчу, дайшоў да Одэра; Макаёнак змагаўся на Поўдні, у Крыму, браў удзел у вядомым Крымскім дэсанце; Кулакоўскі — на Сталінградскім фронце і ў Украіне...” Усе чацвёра прыйшлі ў літаратуру і сцвердзіліся як таленавітыя мастакі, імі сёння ганарыцца нацыя...

Уладзімір Содаль дзеліцца з чытачамі ўспамінамі свайго пасляваеннага дзяцінства ў навелах “Вайна пасля вайны”. Колькі ўжо гэтых гісторый пра голад, чаканне “папкі” з фронту ведае наша літаратура... Але ў кожнай з іх — свой боль, свае пакуты. Не выключэнне і гэтыя навелы, яны чытаюцца як унікальны дакумент часу, пакідаюць глыбокае ўражанне.

Вершамі Міколы Сурначова завяршаецца “паэтычная паверка праз гады і ростані”, якая на працягу года вялася ў рубрыцы “На паверцы — імёны”. Нельга не пагадзіцца з аўтарам прадмоў да публікацый Казімірам Камейшам, які прамаўляе, апелюючы да чытача: “Хай жа гучаць гэтыя імёны на баявой паверцы вечна. Бо ў сапраўднай паэзіі старасці і забыцця не бывае”.

Нізка вершаў Аксаны Спрынчан “Жыццё заўсёды дорыць глыбіню...” відавочна выпадае з кантэксту часопіса. Складваецца ўражанне, што паэтэсу натхняе на творчасць ледзьве не ўсё, што бачаць вочы (як у арабскага паэта — “што бачу, тое і пяю...”): “Дождж красавіцкі імжыць”, “На Нямізе — у весняй раскошы каштаны...”, “У касачоў свята красы”... Мяркуючы па вершах, жыццё якраз *не заўсёды* дорыць глыбіню...

Артыкул “Вузельчыкі лёсу” Вольгі Казловай — гэта шчырая гісторыя не толькі пра яе бацьку, Героя Савецкага Саюза Васіля Казлова, але і пра яго сямейны радавод, пра паплечнікаў і сяброў, сярод якіх былі Якуб Колас, Анатоль Астрэйка, Аляксей Кулакоўскі, Міхась Лынькоў, Максім Танк і інш. Гісторыя ўтрымлівае мноства цікавых, па сутнасці дакументальных фактаў, як той, напрыклад, што ў час вайны В. Казлоў “выратаваў ад фашысцкіх карнікаў будучага беларускага драматурга і кінасцэнарыста Анатоля Дзялендзіка і яго маці Веру Іванаўну — першую сувязную і разведчыцу групы Казлова”. Публікацыя В. Казловай дазваляе ўбачыць асобу нашага славутага суайчынніка, палітыка і дзяржаўнага дзеяча ў іншым ракурсе — як спагадлівага і клапатлівага чалавека, якому, па справядлівых словах Максіма Танка, належыць “наша жывая памяць і ўдзячнасць за ўсё, што ён зрабіў для свайго народа і Радзімы...”

Артыкул Дзмітрыя Бугаёва “Перад фактам здыміце капялюш”, надрукаваны ў рубрыцы “Крытыка і літаратуразнаўства”, думаецца, мае поўнае права быць “настольнай памяткай” для прафесійных філолагаў. Дамінуючыя прыкметы шматлікіх навукова-крытычных прац прафесара Бугаёва — гэта дакладнасць, канкрэтыка, выверанасць фактаў. У дадзенай публікацыі аўтар палемізуе адразу з некалькімі даследчыкамі літаратуры, пераканаўча і доказна абвяргаючы іх меркаванні. Д. Бугаёў падкрэслівае, што ён не супраць так званага навуковага плюралізму — “баяцца разбежак, калі яны і значныя, наўрад ці трэба. <...> Важна, каб не было выдумкі ды падтасовак, няпраўды ў самой фактагалагічнай аснове. А з вытлумачэннем, інтэрпрэтацыяй удумлівы чытач разбярэцца і сам”.

Подзвігу адважных Праведнікаў, якія выратоўвалі яўрэйскае насельніцтва ў гады Вялікай Айчыннай прысвечаны артыкул Эмануіла Іофе “Яны ратавалі цэлы свет”.

Маладосць № 5

Вайна нагадвае пра сябе і праз дзесяткі год, дастаткова часам лёгкага штуршка памяці, і ажываюць успаміны... Апавяданні Анатоля Бутэвіча “Парушанае вяселле” і “Шкадаўлівая” аднаўляюць падзеі ваенных год, але не баі і атакі ў іх сюжэтах, а своеасаблівыя гісторыі кахання ва ўмовах ваеннай рэчаіснасці.

Уражаннямі пра кнігу Анатоля Марозава “Зямля Бялыніцкая” і асабістымі назіраннямі ды пачуццямі, выкліканымі паездкай у Бялынічы на прэзентацыю гэтай кнігі, Раіса Баравікова дзеліцца з чытачамі ў артыкуле “Жыццё — кароткае, бацькаўшчына — вечная”.

Ірына Тулупава прапануе ўвазе чытача два апавяданні — “Аля-вядзьмарка” і “Алёша Шварцэнегер”. Сюжэт першага задуманы, здавалася б, арыгінальна, але інтэрпрэтацыя атрымалася, відавочна, далёкай ад узораў дасканаласці. Гарадская дзяўчына, дакладна не ведаючы “навошта ёй усё гэта патрэбна”, час ад часу прыязджае ў вёску — “яе сюды цягнула амаль магічнае прадчуванне выратавальнага дажджу”. Тут яна ішла на поплаў, каб пакачацца ў росных травах. Пасля здзяйснення гэтага “язычніцкага абраду” заўсёды пачынаўся буйны дождж, які ратаваў ад засухі наваколле. Адной кабеціне дзеянні “вядзьмаркі” не спадабаліся, і яна загітавала (відаць, валодаючы не менш як звышнатуральным дарам пераканання) мясцовых жанок да рашучага манеўру — ліквідаваць траву на поплаве. “Шырокі (!) поплаў, размочаны вільгаццю, здаецца адпачываў, калі на ім з'явіліся ўсе (!) вясковыя бабы. Рэзалі і касілі спраўна. Хто не меў нічога — проста рвалі траву з каранямі. <...> Зямля на поплаве, зарослая і запушчаная (!) <...> нечакана (!) агалілася...” Уяўляеце, як усе вясковыя цёткі, пакінуўшы дзяцей, гаспадарку і гароды, кінуліся выдзіраць траву на поплаве? Масавы псіхоз? А з якім імпэтам трэба было працаваць, каб зямля агалілася *нечакана*? Праўда, праз месяц трава зноў узышла і дзяўчына прыехала ў ёй качацца, аддаваць “накоплены за апошнюю трыццацідзёнку цяжар чалавечых грахоў і нагавораў, сварак, усякіх нікчэмнасцей”...

Уладзімір Ліпскі выступіў у нумары з “аповесцю пра нашы прозвішчы” пад знакавай назвай “Мы”. Думаецца, гэтаму твору значна больш прыдалося б жанравае вызначэнне “слоўнік з каментарам”, бо ніякіх прыкмет, уласцівых аповесці, тут не відаць. Пералічваць ды вытлумачваць “гаваркія” прозвішчы, этымалогія якіх навідавоку, — справа не надта адмысловая... Акрамя таго, часам зусім розныя характарыстыкі “сцягваюцца” ў адну кучу і дастасоўваюцца да пэўнага раду, напрыклад: “Худога, сухарлявага, хваравітага [першая — **Л. А.**], пазбаўленага душэўнага цяпла, эмоцый, жывасці [другая — **Л. А.**], які ўмеў выйсці сухім з вады [трэцяя — **Л. А.**] маглі называць: Сухаў, Сухінін, Сухабок, Сухарэнка, Суханкін...” і г. д. (усяго 24 найменнікі). Дарэчы, пераважная большасць прыведзеных аўтарам звестак ужо даўно і даволі шырокавядомая, як вядомыя і прыпавесці-паданні, якімі “перасыпаны” даўжэзныя шэрагі прозвішчаў. У прыватнасці “зачын” аповесці пад назвай “Як у казцы” ўтрымлівае паданне пра палешукоў і палевікоў, якое нават увайшло ў школьныя падручнікі па беларускай мове (9 клас, Мн., 2000, с. 32) у якасці практыкавання “кантрольнае спісванне”.

Нёман № 5

Часопіс надрукаваў вытрымку з выступлення Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнкі на пасяджэнні Рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенню святкавання 60-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Разгорнутай падборкай вершаў “Мосты нашей дружбы” прадстаўлена ў нумары ваенная паэзія трох братніх народаў — беларускага (Кандрат Крапіва, П. Прыходька, П. Прануза, М. Пазнякоў, А. Цяўлоўскі), украінскага (Б. Олійнік) і рускага (С. Шчыпачоў, В. Дудараў, Я. Няфёдаў).

Асобная “паэтычная старонка” часопіса прысвечана творчасці Аляксея Пысіна (пераклад з беларускай Б. Спрынчана). У вершах 60-х гадоў паэт нанава асэнсоўвае пройдзеныя ваенныя шляхі, вяртаецца ва ўспамінах да перажытага, якое вярэдзіць душу па-ранейшаму, не адпускае і праз дваццаць год пасля вайны. Думаецца, лейтматыў усёй нізкі твораў можна вызначыць радком з верша “Иванчай” — “Слишком много в сердце горькоты...”

Гэтаксама асобнай “паэтычнай старонкай” друкуюцца ў “Нёмане” вершы Яўгена Каршукова. Дарэчы, творы гэтага ж аўтара грунтоўна прадстаўлены і ў “Полымі”, надрукаваны на шасці старонках. Некаторыя з іх займелі публікацыю ў двух варыянтах — на беларускай мове ў адным часопісе і на рускай — у другім. Мяркуючы па такой “прадстаўнічасці”, творчы плён Я. Каршукова заслугоўвае асаблівай пільнай увагі, так што шчыра раю чытачу азнаёміцца. Прыкра, аднак жа, што творам класікаў — Танка, Панчанкі, Куляшова, не кажучы ўжо пра Коласа і Купалу, — месца ў юбілейных нумарах не знайшлося.

Часопіс пачаў друкаванне рамана Алеся Савіцкага “Оболи крутые берега” (пераклад з беларускай Н. Чайкі). Сюжэт твора прысвечаны жыццю моладзі ва ўмовах фашысцкай акупацыі, дзейнасці камсамольцаў-падпольшчыкаў. Аўтар дэталёва адлюстроўвае эмацыянальныя станы герояў, перадае гнятлівую атмасферу акупацыйнай рэчаіснасці, прасочвае тыя шляхі, якімі ішлі юнакі і дзяўчаты да разумення неабходнасці супрацьстаяння ворагу, да рэалізацыі сваіх дзёрзкіх планаў.

Малыя жанры мастацкай прозы, прысвечаныя падзеям Вялікай Айчыннай вайны, прадстаўлены ў нумары апавяданнем Янкі Сіпакова “Партызанскі парад” (пераклад з беларускай Т. Мартыненкі) і навелаю ўкраінскага пісьменніка Міхайлы Сірэнкі “Майскія эшалоны”.

Гутарку пра беларускую паэзію ў гады вайны, пра яе выключную ролю ў падтрымцы баявога духу суайчыннікаў вядзе з чытачамі Васіль Макарэвіч у артыкуле “Муза в солдатской шинели”. Валянціна Локун дзеліцца меркаваннямі пра дасягненні беларускай эпічнай прозы пра вайну ў артыкуле “Эпопея — это народ...”. Аўтар засяроджвае ўвагу на мастацкіх асаблівасцях раманаў Кузьмы Чорнага, І. Чыгрынава, М. Лынькова і адзначае ролю гэтых твораў у развіцці айчыннай празаічнай літаратуры.

Лада АЛЕЙНІК

Мікола ШАБОВІЧ



* * *

Віруе-пеніць любасці рака
І з вуснаў песня просіцца ў сінечу,
Калі рукі кранаецца рука
І сэрца птушкай злоўленай трапеча.

Сягоння свята— свята нашых рук.
Хай дзень сустрэчы доўжыцца да ранку,
Каб пад шчаслівы нашых сэрцаў стук
Мы збудавалі з мараў-сноў альтанку,

Дзе б толькі мы, і толькі мрой сакрэт,
Сасмяглых вуснаў козыт сарамлівы.
Хай гэта будзе толькі наш Сусвет,
Што для дваіх, як казачнае дзіва,
Давай яго заўсёды берагчы
І затуляць ад позіркаў зайздросных,
Пакуль руцэ не млосна на плячы,
Пакуль плячам ад нашых рук не млосна!

* * *

Я не веру, што ты далёка,
Бо усмешка твая са мной
Над самотаю і маной,
Над капрызамі злога року.

Спавядальны твой маналог
Я гатовы да ранку слухаць,
Каб на хвілю ўявіць адну хоць
Тайну рук тваіх, тайну ног,

Спаднябесную сінь вачэй,
Мар-жаданняў тваіх сваволю,
Што не ўдасца забыць ніколі,
Аж праз тысячы дзён-начэй...

Над капрызамі злога року,
Над самотаю і маной
Зноў усмешка твая са мной...
Я не веру, што ты далёка.

* * *

"Да хуткай сустрэчы!" —
хачу табе сёння сказаць,
Мая Незнаёмка, Фантазія, Мара, Надзея.
Свавольнага лета салодкія мроі віраць,
І з кожнай хвілінай спакусы віно саладзее.

"Да хуткай сустрэчы!" А ты ці жадаеш, скажы,
Пакінуўшы казку, ў зрыжэлую восень вярнуцца,
Дзе рук тваіх тонкіх абрысы, як сны-міражы,
Дзе сэрца трапеча ў чаканні дзівосных пачуццяў.

Да хуткай сустрэчы! Я веру, што ўсё —
не падман,
Што вусны, нарэшце, спатоляць і смагу,
й сумоту.
Хіба ж не пачаўся наш сонечна-рыжы раман,
Калі я сказаў: "Падары мне сваю адзіноту"?

* * *

А дні нястрымана ляцяць,
Назад у снах адно вяртаюцца.
То весналіста шалясцяць,
То жаўталіста асыпаюцца.

Шчэ толькі ранак палымнеў,
А ўжо на захад сонца коціцца,
Нам пакідаючы сумнеў:
Ці весяліцца, ці маркоціцца?..

У кожнадзённай мітусні
Не разгубіцца б, не зняверыцца,
І, можа быць,
пяшчоты дні,
Нібыта птушкі ўвесну, вернуцца...

Кацярына ІНДЗЮКОВА

Ноч над Дзвіной

Ноч захінае зямлю туманамі,
Вогнішча зоры ў неба кідае,
Ціха гітара спявае мая.

Рыба гуляе ў мутнай рацэ,
Неба бяздоннае дрэмле яшчэ.
Ціха крыламі б'юць кажаны.
І вадзянік верхам сеў на сама.
Плешча аб вёслы
рачная вада.
Жабкі пяюць каваціны ўначы.

Белы агеньчык мне свеціць
з туману,
Ноч паступова ў світанні згасае.
Сонца ўзыходзіць,
і певень спявае.

Калі я зраблюся русалкай

Хутчэй бы надышло лета.
Будзе гарачае сонца.
Мае думкі выгараць,
Як мае валасы.
Стане лягчэй дыхаць.
Я цябе забуду.
Я сальюся з вадою
У хуткай чорнай рацэ.
Мабыць, я зраблюся русалкай.
Тады я ў цямрэчы буду
Спяваць сумныя песні
Аб тым, што кахала цябе.
Ахінуся цёплым ветрам,
Упляту ў валасы лілеі.
А потым сяду на камень
І крыху паплачу адна.
Ты таксама хутка забудзеш
Мой твар, мой голас і вочы.
Ты знойдзеш сабе іншую,
Але я застануся з табой.
Калі ж раптам мяне ўзгадаеш,
То прыходзь на бераг рачулкі.
Абяцаю, я буду ўжо там
Чакаць цябе ў віры.
Садзіся на траву.Толькі ціха.
Я цябе ўбачу.
Плескану хвастом па вадзе
І пакіну на памяць жамчужыну.
А пакуль што яшчэ — толькі травень.
І ў нас няма часу.
Таму я ўжо шукаю
Жамчужыну для цябе.

Васіль ДЗЕРАВЯШКА

Бялынічы

Весняю паводкай зноўку круціць
На рацэ шырокай чорны вір,
Вастраверхім стогам па-над Друццю
Тут стаяў калісьці манастыр.

Ёсць паданне: яго сцены клалі
Рупныя прыгонныя майстры,
Белымі начамі працавалі,
Палячы высокія кастры.

Назва шліфавалася гадамі...
Каля млыну плынь парвала гаць,
Новымі вышыннымі дамамі
На прастор Бялынічы глядзяць.

Белай поўняй узыходзяць ночы,
Па-над Друццю сцелецца туман...
Мне заўжды святло струменяць вочы
Шчырых землякоў-бялынічан.

Поле

Ад грэчкі — белым,
Ад руні — зялёным,
Ад лубіну — жоўтым,
Ад птушак — вясёлым,
Мірным і дарагім,
І ніколі чужым
Не ведаў я поля
У краі маім.
З аповеду бацькі толькі,
Нібы ў сэрца іголкі, —
Мроіцца ў жудасным сне:
Падаю ў чорны снег...
Вогнішчам сярод нівы —
Снарадаў разрывы.
Поле бомбай прабітае,
Поле крывёю палітае,
Журботнае і пустое
Поле пасля бою.
І сёння мне
Наяве, не ў сне,
На самай крайняй
Яго баразне,
Каб жаўруку не змаўкаць,
Трэба на варце стаяць
Хоць камнем,
Да глебы прыкутым,
Хоць дрэвам —
Высокім, магутным,
Каб берагчы на зямлі
Сон цёплай раллі,
Руні песню без слоў,
Скарб залатых каласоў,
Садоў маладое цвіценне.
На жаль, немагчыма
Такое пераўтварэнне...

Прыму без ваганняў,
Без нараканняў на лёс,
І нават без слёз
На грудзі свае, як на поле,
Разрывы снарадаў шалёных,
Бомбаў смяротны напалм,
І вогнішчам стану я сам.
Толькі б ад грэчкі белым,
Ад руні зялёным,
Ад лубіну жоўтым,
Ад птушак вясёлым,
Мірным і дарагім —
Без эпітэтаў адваротных —
Называлі паэты і земляробы
Поле ў краі маім.

Паміж кубкам і вуснамі

Казімір КАМЕЙША

● Спадар Р., з якім мы кожны дзень сустракаліся на адных і тых жа рэдакцыйных калідорах, не слыў узорным сем'янінам. І ў чарку часта заглядваў, і дамоў мог прыйсці пад самую раніцу, а то і зусім не прыйсці. А неяк знік, не было на працы цэлы тыдзень. Жонка сабе шукае, галоўны — сабе, падключылі нават міліцыю. А я вяртаюся неяк з працы і бачу: выбівае ў маім двары чужыя дываны. Шмыгнуў я незаўважна ў пад'езд, каб не рабіць яму брыдка і не сказаў нікому пра тое. І яму ніколі не сказаў. Сам не малы, ведае, што творыць.

А вось выхаванню сына калега мой надаваў і надта многа ўвагі. Падыме яго раніцой соннага — і на прабежку да возера. Той упарціцца, курчыцца, трэ заспаныя вочы, а бяжыць за бацькам. Прысядзе недзе за кустом: за жывот хапаецца, хворага корчыць. Упарты рос хлапчук. За кнігу не ўсадзіць, у школе няўважлівы. Адзінае, за што ахвотна ўзяўся сынок, — гэта пісаць свой дзённік.

— Некалі пачытаеш, — казаў бацька, — пабачыш, якім ты быў. Запісвай усё, да дробязяў.

Той пісаў. А бацьку браў нясцерп зазірнуць калі-небудзь у той дзённік, пацікавіцца, чым жа ён там дыхае, яго сынок. Неяк такі момант надарыўся. Прачытаў некалькі старонак і ледзь не ашалеў на адным запісе: "Сёння зноў гэты дурань прыйшоў п'яны. Зараз пачне мяне выхоўваць..."

● — Ты ведаеш, — хваліўся часта ён, — тады я сабе мог дазволіць... Ну, як жа, думалася мне, каб сабе ды не дазволіць. Не каму ж чужому.

● Анатоль Грэкаў паскардзіўся мне на тутэйшае варварства. Гэта ж трэба, з алеі коласаўскіх герояў, што цягнецца з Акінчыц да Мікалаеўшчыны, нехта ўкраў слуп з выявай Сымона-музыкі. І дагадка: "Відаць, нехта прыехаў на машыне і завёз рэліквію на сваё лецішча".

Хтосьці з нас пажартаваў:

— Трэба перш за ўсё шукаць на дачах землякоў: Хвалея, Камароўскага, Камейшы.

— І Грэкава! — дабавіў другі.

— У Хвалея машыны няма, — паправіў хтосьці. — Да Фаніпаля на плячах ён той слуп не давалачэ.

Жарты жартамі. А знікла рэч каштоўная, мемарыяльная. Магло быць і горш, заезджыя турысты-авантурысты маглі пусціць яго на дровы і спаліць. Але засмучае іншае, само разуменне каштоўнасцей нашай культуры.

● Пацешна бывае гартаць старыя ды і новыя дамашнія альбомы, дзе ўсе здымкі змайстраваны "пад позу" і каманду фатографа. Здзіўляюць і гэтыя дзяўчаткі з няўмела апушчанымі рукамі, і грузнаватыя мужчыны, што не ведаюць, куды падзець тыя рукі, і гэты тварык, што так наіўна, быццам птушаня, цягнецца з-за чыйёсьці галавы, каб патрапіць у аб'ектыў. Усе глядзяць у адну кропку і ўсе як скаваныя.

● Па дарозе з Клайпеды ў дзюны запомніліся рыбалоўныя сеткі, што прасушваюцца на сонцы і ветры, і самі ўжо нібыта дапаўненне таго плоту. На ветры яны прысвіствацюць, ледзь не спяваюць. І спеў гэты вельмі падобны на птушыны. Гэта — як перагук з самой Нідай, дзе нас сустрэне станцыя кальцавання.

● Я няшмат дзе бываў у свеце, больш кружляў каля родных берагоў і сцежак, але хіба мала гэтага для таго, каб зразумець наш свет так, як разумею яго я, домаўседлівы пушчанец.

● У тых партыйных прэзідыумах была і вялікая непрадуманасць: Ленін заўсёды заставаўся ззаду, за спінай прэзідыума. Паспрабуй ты пакіруй з-за спіны!

● Старшыня калгаса скардзіўся: "Калі ў гэты тэлевізар усунуць яшчэ пару серыялаў, то працаваць мне ўжо не будзе з кім".

● Мабільная сувязь пушчы, яе карані і кроны, ніколі не дадуць збою перад сэрцам і смуткам пушчанца.

● Моц тутэйшай самагонкі вымяралі па моцы Вінцэсевай збажоўкі. Яго ў гэтай справе ніхто не мог пераплюнуць. Так і казалі:

— Пяцьдзесят градусаў па Вінцэсю.

● Няма чаго здзіўляцца, што тых, хто піша вершы, у нас з кожным годам усё больш і больш. Для нас, як і для палякаў, паэзія, магчыма, самае галоўнае мастацтва. Такая, пэўна, будова нашай душы. У нас і дзіцячы плач, і нават праклён маюць свой унутраны рытм. Гэта настойліва не хочуць разумець тыя, хто не хоча чытаць нас на роднай мове.

● З новых анекдотаў:

— Якая ў вас зарплата?

— Калі я гляджу тэлевізар — дык і надта вялікая, а калі прыходжу ў краму — дык і зусім малая.

● Дарэмна думаць, што ў малога грэшніка не можа быць вялікіх грахоў. Жыццё таго не выключае.

● Сёння ішоў праз гарадскі двор і ўбачыў дзяўчынку гадоў дзесяці, якая ладзіла сабе букет з суквецця расквітнелай ліпы. А потым вяртаўся назад і заўважыў яе з кулёчкам семак, якія, пэўна ж, купіла ў бабулі каля крамы. Прабягаў нейкі бэйбус са школьным ранцам за плячыма, піхануў яе пад локаць, і семкі тыя пасыпаліся на асфальт. Яна нагнулася і пачала падбіраць іх, памкнуўся і ён да тых семак, але спалохаўся мяне, адбегся ўбок. Я не бачыў слёз у той дзяўчынкі, але сэрца ў грудзях тужліва затрымцела. Як многа крыўд, чалавеча, нават на пачатку твайго шляху. А чынім іх мы сабе самі.

● Дзе людзі хаваюць грошы? Во пытанне. Дзе толькі ні хаваюць. Золата, скажам, здаўна закопвалі ў зямлю. Потым знаходзілі яго праз стагоддзі, а то і зусім не знаходзілі. Добрым спратам для рубля ёсць банк. Але і яму апошнім часам мала веры. Знікаюць і там нашы грошыкі. Хаваць у шафе — небяспечна: і злодзей можа ўкрасці, і тыя ж мышы з'есці. Дык дзе іх хаваць? Тут у кожнага свае прыдумкі.

А як схаваць, калі спатрэбіцца, грошы ад уласнай жонкі? І такая неабходнасць часам выспявае ў жыцці. Тут таксама ў кожнага свае прыдумкі. Адзін у бот засуне, другі — у нейкую шчыліну. А пісьменнікі, кажуць, хаваюць іх у кнігі. Пакладзе між старонак — і бывае, што знаходзіць толькі праз гады. Пакладзе... і забудзецца. Добра, калі грошы не памяняюцца ці не ўпадуць у цане. А жыццё ж наша вельмі зменлівае. Ад яго ўсяго чакай.

Адзін мой знаёмы ўжо нашто быў знаходлівы ў гэтым сэнсе, а пабочныя грошы як ні схавае, іх тут жа знойдуць ці жонка, ці цешча. Неяк сунуў іх у шкарпэткі. Прачынаецца — і бягом да тых шкарпэтак, а іх памыла і сушыць цешча, а заадно прасам прасушвае і пяцёркі, якія адтуль выплылі. Ледзь не заплакаў бядак.

Але аднойчы схаваў так, што і сам ледзь адшукаў. Быў, вядома, на добрым падпітку. Прачынаецца раніцой — мац па кішэнях — няма. Не знайшоў і ў стале, і ў "дыпламаце". Кінуўся да жонкі:

— Ты не брала ў мяне грошы?

А тая ў наступ:

— А колькі там было?

А было там і дабравата. Але ж няма ўжо. Прысеў за стол, задумаўся. Пачаў з гора перакідваць настольны каляндар, раптам на перадапошняй старонцы бачыць стрэлку і надпіс: "Глядзі ўгору!" Уключыў ён модную тады талерку-люстру — і бачыць на ёй нейкія цёмныя плямы. Стаў на табурэт, зазірнуў у тую талерку і ледзь не самлеў ад радасці. Гэта былі яго грошы. Вось так яно. Былі б толькі грошы, а схаваць іх заўсёды можна.

● Некалькі разоў на тыдзень ён вяртаўся з горада з пляшкай "белай". Ставіў яе за статуэтку Шаляпіна, каб не бачыла жонка ды яшчэ весела падміргваў вокам: "Гэта нам на сёння, дзядзя Федзя!"

● — Ну што ты мне новага скажаш, Чэсік? — пытаецца дзед пяцікласніка-ўнучка, скручваючы жоўтымі ад тытуню пальцамі самакрутку.

— Што я вам, тэлівізар ці што? У яго пытайце пра новае, — лагодна агрызаецца малы.

— Я во зараз пагляджу ў твой дзённік, які ў цябе там цілівізар, — сярдуе дзед.

— Які ў яго цілівізар? На два каналы, — з кухні выходзіць маці Чэсіка, якая чуе тую размову. У Чэсіка і сапраўды сёння ў дзённіку муляецца двойка, але лісты з ёю ён умела выбавіў і схаваў у нейкі сшытак. Заўтра зноў іх асцярожна адправіць на сваё месца, нават распішацца за бацьку так, што ніхто не падкапаецца. Гэта ён умее ўжо даўно.

— Як ты ўрэшце з дзедам размаўляеш? — злуецца маці. — Вось скажу бацьку, хай ён папругі табе добрай усыпле.

— Ну, а што можа новага ў нас быць? — не здаецца Чэсік. — Настаўнікі старыя, школа старая...

Дзед слухае тое нават задаволена: у кішэню не лезе за словам хлопец. І гэта ўжо добра. А новае ў яго яшчэ — наперадзе.

● Малы ўнук бачыў, як дзеда перад смерцю кармілі з лыжкі. Калі дзед памёр і ўнуку патлумачылі, што такое смерць, сказалі, што дзеда закапаюць, ён горка заплакаў:

— А хто ж яго там будзе з лыжкі карміць?!

● Гэта заўсёды прыемна, калі нехта незнаёмы не дае табе тваіх гадоў, лічыць цябе на добрую дзесятку маладзейшым. Такое здараецца ў нашым жыцці. А бывае і наадварот...

Мой знаёмы на вясковым вяселлі ў застольнай гамане сядзеў побач з маладымі хлопцамі, а тыя ўсё падліваюць і падліваюць яму ды яшчэ прыгаворваюць:

— Ну, яшчэ па кроплі, дзядуля!..

І таго гэта разлавала, ён аж працверазеў. Было ж таму "дзядулю" крыху больш за трыццаць...

Ну, а другі мой знаёмы сядзеў са сваім малодшым сынам у гарадскім скверы, а малы бегаў, дурэў, не даваў бацьку пачытаць свежую газету.

— Супакойся, бо папругі зараз урэжу, — злаваўся бацька.

— Дзядулю трэба слухацца, — паўшчувала малога жанчына, што праходзіла побач.

І ўзлаваўся наш "дзядуля", схапіў сына за руку і хуткім крокам падаўся дахаты.

● Хведар Чэрня гадаваўся пры мачасе. Маці памерла, калі малому і года не было. Слова "мачаха" вельмі часта гучала ў вясковай хаце. Яно нават палохала малога Хведара. А неяк ён, дурэючы, незнарок зламаў вазон. І спалохаўся, прыбег у хату і са слязьмі:

— Цёця, мачаха, даруйце! Я зламаў ваш вазон.

І ў тае з вачэй міжволі закапалі слёзы.

● Пытанне тэлевядучага да пажарніка:

— Вы ўсё жыццё пражылі ў Маладзечне?

— Усё, — адказвае.

А жыцця таго ў яго яшчэ і дваццаці гадоў няма.

● Жонка да мужа:

— Чаму твае ключы ад работы валяюцца пад халадзільнікам?

Муж:

— Значыць, я астыў да работы.

● Ці гэта вялікая мудрасць — цытаваць бясконца некага з вялікіх? Гэта ж яшчэ не значыць, што і ты сам такі ж вялікі.

● Людзі адыходзяць у лепшы (а хто гэта ведае?) свет, забіраючы з сабою і шмат ад таямніцы. Яно і знікала разам з імі. О, калі б гэта ўсё заставалася нам, жывым. Але ж, пэўна, так хацелі яны самі, тады яшчэ жывыя.

● Неба, аказваецца, зусім не ўсміхаецца маланкаю (А. Наўроцкі). Гэта я зразумеў, калі аднойчы падчас свайго пастухоўства трапіў ажно пад дзве навальніцы. О, як секлі, як жахалі тады маланкі! І схавацца нідзе не схаваешся. Вакол лес, гонкія высокія дрэвы, нідзе ніводнага маленькага кусціка. Хацеў кінуцца пад бліжні мост, ды ўспомніў, што каля вады хавацца небяспечна. Ах, не хацеў бы я такіх "усмешак".

І яшчэ да той самай тэмы. Згадаліся словы "Гром сярод яснага неба". Толькі нядаўна зразумеў, які жахлівы сэнс тут прыхаваны. Пазамінулым летам мы з братам павезлі ў суседнія Астравы жалезныя вароты, каб прыварыць да іх завесы. Зваршчык, малады хлопец гадоў дваццаці з нечым, згадзіўся нам дапамагчы. Пачалі мы варыць. Адварочваемся ад зваркі, каб не нахапаць у вочы "зайчыкаў". Патрэсквае электразварка, ляцяць іскры. А неба яснае, добра-такі смаліць сонца. І раптам сухаваты, рэзкі ўдар перуна, нібыта стрэл з-за пляча. Нават не бліснула маланка. Хлопца адкінула да самых сянец, ён нават некалькі разоў кульнуўся. І ледзьве прыйшоў потым у сябе. Яго шчасце, што абуты ён быў у кеды на гумовай падэшве. Кепскае чакала б і нас з братам, хто падтрымліваў тыя вароты незадоўга да перуновага стрэлу. Вось што такое — "гром з яснага неба".

Нашага зваршчыка адвезлі ў раённую бальніцу. Ён хутка ачуняў. Толькі нарадзіўся, відаць, хлопец не пад шчаслівым знакам. Нядаўна даведаўся, што ён раптоўна памёр.

Ведаю адно — усё стыхійнае ў прыродзе страшнае.

● У гэтым садзе даўно ўжо няма садоўніка. Галіны яблынь густа пакруціліся, перапляліся, шмат дзе пазасыхалі, у ствалах пазначыліся цэлыя дуплы. Але сад усё яшчэ плодны. Добра пачувае сябе сонечна-белы наліў, крыху горш — антонаўка. І панадзіўся залятаць сюды пушчанскі дзяцел. Досвіткам выйду ў двор, а ён ужо далатуе дзюбай нейкую старую галіну. Ну і няхай лечыць сад. Ён тут цяпер самы галоўны садоўнік.

● Памятаю, як першым разам трапіў у Эрмітаж. Было гэта на першым годзе вайсковай службы, марозным і сырым аж да калючасці днём. Пры ўваходзе, ля вахцёра, ляжала гара тапкаў. Мы доўга і смешна прывязвалі іх доўгімі матузкамі да сваіх растаптаных кірзачоў, чамусьці трапляліся адны правыя. Хадзіў потым і баяўся, каб не грымнуцца на падлогу. У залах было многа шэпту, экскурсаводы перабівалі адзін аднаго. З усіх карцін адна гэта і засталася ў памяці. Усё астатняе трэба было ісці потым глядзець аднаму, доўга, пільна, пакуль не адклалася яно не толькі ў вачах, а і на сэрцы.

● У старасці чалавек бачыць або занадта далёка, або зусім нічога не бачыць. А ў маладосці ён здольны бачыць далёка і многа, але не бачыць сябе самога.

● Жалезныя жураўлі пад'ёмных кранаў — зусім не паэтычны вобраз вялікага горада. Але і яны сваім жалезным "курлыканнем" вяртаюць вяскоўца не столькі ў вёску, колькі ў дзяцінства, якое ўсё часцей і часцей прыходзіць у ягоныя сны. Так жадаюць самі гады.

● Распальваю дачную печку газетамі са старой хлуснёй, якая ні чуць не горшая за новую. А дата зверху, пад загалоўкам, змушае згадаць і нейкі свой забыты дзень, які ўсё ж застаўся ў памяці.

Жыццё само піша свой каляндар памятных дат, выкрэсліваючы з яго часам цэлыя гады.

● Прырода — не палітыка. У ёй усё падаўняму і добраму суразмеркавана. Тут нават апазіцыя дажджу, снегу, марозу ды галалёду нікога не абурае і не крыўдзіць. Адзін толькі ён, чалавек, як парушаў, так і парушае яе спрадвечныя і мудрыя законы.

● Я ўжо даўно не "поляк малы", хоць яшчэ і не вырас у сапраўднага сярэдняга беларуса.

● Вось ужо які год гартаю адрыўны каляндар "Родны край" і сумую ад яго аднастайнасці. І аўтары ў ім адны і тыя ж. Хоць час і мяняецца, а календары, аказваецца, могуць сябе паўтараць. Тут жа натыкаюся на словы калыханкі:

Спі, мая дачушка,
— Засыпай, дзяўчо —
Заінька пад вушка
Падлажыў сучок.

А хай на вас! Засні ты паспрабуй, калі табе пад вуха сучок падклалі.

● Расказваю свайму земляку-жывёлаводу, што ў Ізраілі каровы тры разы за дзень прымаюць душ. А ён мне:

— У нас і даяркі, і пастухі, можа, ні разу таго душа не бачылі. Добра што яшчэ падаслаць ёсць чым. А было ж, што салому ездзілі пазычаць.

— А мух там каровам вентылятарамі абганяюць, — працягваю я. — Даюць адпачыць хвасту, які на тое прыдуманы самой прыродай.

— Чаго не прыдумаюць, — кажа зямляк. — А па мне хай будзе менш малака, а хвост сваё робіць.

(Працяг на стар. 15)

Час — еўрапейскі!

Нясвіжскія занатоўкі. У жанры незабудак

Пра музу Журналістыкі ніхто ніколі нічога не кажа. Але, здаецца, тут, сярод нясвіжскіх апякунак натхнення і творчасці, усяго прыгожага, разумнага, добрага, вечнага, блукае і яна... Блукае ды падбухторвае да рамантычных наіўных прызнанняў. У тым, напрыклад, што ўспрымаю Нясвіж ужо не як горад-помнік, а як жывую родную істоту. Магу яшчэ прызнацца: гэтым разам успрымала Нясвіж не праз ахінуты легендамі замак, а праз ратушу — сведку самавітасці места, знак магдэбургскага права. Успрымала праз парк. Праз музыку. Праз людзей.

•

Абжываецца ратуша. Сюды ўжо водзяць экскурсіі. Звяртаюць увагу на унікальны адрэстаўраваны радзівілаўскі більярд (пра яго "ЛіМ" пісаў летась), які гітлераўцы не звезлі таму толькі, што адмысловы столік проста не пралазіў у дзверы і не знайшлося прылады, каб спусціць яго ў двор праз акно. Паказваюць старадаўні керамічны ды медны посуд, кафлю (паводле якой аднаўляліся ратушныя печы), рэдкасны іканаграфічны матэрыял... У ратушы прайшла прэзентацыя кніжнай навінкі "Музы Нясвіжа" — 10 год разам", выдадзенай да фестывальнага юбілею ў новай мясцовай друкарні імя С.Буднага. Увечары, як ішлі тут пасля канцэрта, уразіў амаль містычны напамінак пра час. Высока свяціўся цыферблат на ратушнай вежы. Стрэлкі настройваліся на "серэнаду". А ніжэй, за шклянымі дзвярыма "Культтавараў", што ў гістарычных крамных радах, пабліскваліправільна круглыя насценныя гадзіннікі: белыя і чорныя, з выразнымі лічбамі, паўз якія, пэўна, рухаліся стрэлкі...

•

На фестывалі "Музы Нясвіжа", як заўсёды, радуе майстэрства выканаўцаў. Аснову канцэртных праграм — такая традыцыя! — рыхтавалі камерныя калектывы, што працуюць у структуры Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам М.Фінберга. Усе музыканты выдатныя: моладзь, неаднойчы ганараваная лаўрамі на міжнародных конкурсах, дацэнты і прафесары. Гэта і камерны аркестр з дырыжорам В.Сарокам, і ансамбль флейтыстаў "Сірынкс" пад кіраўніцтвам Н.Аўраменкі, і ансамбль трубачоў "Інтрада" на чале з М.Волкавым, і Актэт салістаў на драўляных духавых інструментах са сваімі кіраўнікамі Б.Нічковым ды Г.Гедыльтарам. З'явіўся ў структуры аркестра і дэбютаваў на фестывалі Ансамбль кларнетыстаў пад кіраўніцтвам Г.Забары. Дэбютаваў таксама і ансамбль педагогаў Нясвіжскай школы мастацтваў "Канцона", у якім удзельнічае і якім кіруе вядомы мінскі віяланчэліст А. Алоўнікаў.

А ў разгар першага (балазе, сонечнага) фестывальнага дня на цэнтральнай плошчы прайшоў канцэрт, наладжаны Нацыянальным акадэмічным народным хорам імя Г.Цітовіча, Дзяржаўным ансамблем танца Беларусі ды капэлай "Санорус", прысвечаны юбілею Перамогі.



Распачаўся X Беларускі фестываль камернай музыкі вялікай вечаровай праграмай пад назваю "Нясвіжскія шэдэўры". Урачыстаму адкрыццю, паводле традыцыі, папярэднічаў вернісаж. Як файна: пастаяць у жывым кутку дзівосных вобразаў, створаных выхаванцамі С.Купрыянавай — маленькімі чараўнікамі, што наведваюць яе студыю выяўленчага мастацтва пры Палацы культуры Мазырскага нафтаперапрацоўчага камбіната. А побач — экспазіцыя унікальных фота з сядзібы М.Кл.Агінскага — Залесся...

•

Творы М.Кл. Агінскага, А. ды М.Радзівілаў, Э.Ванжуры, Я.Голанда, С.Манюшкі... Класіка наша. Але канцэртам старадаўняй музыкі праграма першага вечара не вычэрпвалася. Трохі пазней адбылося "Спатканне з джазам" — упершыню ў кампанію нясвіжскіх муз улучыліся зоркі Біг-бэнда Дзяржаўнага канцэртнага аркестра. Маэстра Фінберг, які непасрэдна кіруе бэндам, пайшоў на творчую рызыку, і яна сябе апраўдала: своеасаблівы дайджэст сёлетняга мінскага свята класічнага джаза дадаў публіцы свежых музычных уражанняў.

•

Заключная фестывальная імпрэза: музыка гучала такая розная! Ад ананімнага "Полацкага сшытка" да матываў В.Длугарая, ад Агінскага да Туранкова, ад Ельскага да Чуркіна, ад Багатырова да Глебава. Творы Л.Абеліёвіча, Д.Смольскага, У.Солтана, У.Дамарацкага, Г.Ермачэнкава, В.Іванова, У.Каральчука, Г.Гарэлавай. Большасць з гэтых імёнаў ужо належыць вечнасці... Нясвіж, спрадвек горад адной старажытнай дынастыі, паўстаў сядзібай муз для новых дынастый. Дынастыі творцаў (сярод кампазітараў — настаўнікі ды вучні, музычныя "бацькі", "дзеці", нават "унукі") і слухачоў (на "Музах Нясвіжа" ўзгадавалася дасведчанае пакаленне меламанаў).

Нечаканая свежасць, вабнасць адкрыццяў у амаль забытым — плён адмысловых аранжыровак А.Шпянёва, Л. Ласоцкай і Г.Гедыльтара. А падбор фестывальнага рэпертуару, вядома ж, мае гістарычную, навуковую абгрунтаванасць дзякуючы доктару мастацтвазнаўства В.Дадзіёмавай — нязменнай вядучай і каментатару канцэртных праграм.

•

Дзве пары кабылак. Прагулачная карэта ды брычка. Вось дык транспарт! Узрушэнне журналістаў, якім выпаў гонар абнавіць гэты набытак горада, не мела мяжы. Ад плошчы даехалі да касцёла, потым — да замка. Конюх П.Макаш сам апрануты "па форме" і ад напарнікаў патрабаваў: "Капялюш апрані, пяро папраў...". Ідэя катання на конях узнікла ў мэра Нясвіжа Ф.Прывалава пад уражаннем ад еўрапейскіх гарадоў, дзе конныя экіпажы задзейнічаныя ў шлюбных цырымоніях, дзе на іх катаюць мясцовую дзятву ды замежных турыстаў. Праз пабрацімаў у Польшчы было знойдзена прадпрыемства, дзе робяць адмысловы транспарт, зрабілі заказ. Набылі прыгожых арлоўскіх рысакоў і поні, ды пакуль не паспелі аб'ездзіць: жарабцы ўжо дарослыя і гарачыя, наравістыя, з імі давядзецца папрацаваць. Таму і трапілі на баль рахманыя кабылкі з вясковай гаспадаркі, прывучаныя ў Снове вазіць малако: іх падстрыглі, памылі з шампунем, зрабілі "манікюр" — і выправілі ў горад.

•

Атласныя і сакавітыя, непакошаныя, у адрозненне ад паскубаных сталічных, газоны ў сонечных дзьмухаўцах. Коні ласуюцца майскай травой... Нейкая ў гэтым свая філасофія, свая міфалогія. Як і ў кветках радзівілаўскага парка, ахінутага чаромхавым воблакам. Вось — прымула, або першацвет, або ключыкі: зямныя адбіткі залатых ключоў апостала Пятра, якія адмыкаюць для нас дзверы ў цёплае лета, ці, паводле старажытнагерманскіх паданняў, — ключы багіні вясны, якімі пазначаны яе шлях... Іх багата на стромах канала, сагрэтых сонейкам. Вось — кветка рыцараў, кахання і варажбы, кветка-зорачка, вядомая з англійскай паэзіі як "Day's eye", вочка дня, ці больш пяшчотна — "Daisi", Дэзі (так называюць у Англіі ўладальніц імя "Маргарыта" дый саму кветку). Маргарыткі, як заўжды, на паляне Марысінага парка. А гэта кветкі пастаянства і вернасці, незабудкі: тут яны ва ўсіх прысадах, ля кожнае сцежкі...

•

У замку працягваецца рэстаўрацыя: адна з вежаў аднаўляецца паводле выявы XVI, другая — XVIII ст., што дае магчымасць убачыць, які быў замак у розныя эпохі. Раскрыццё абвадных валоў дапамагае вывучэнню гісторыі будовы: раскопваючы бастыён, адкрылі каменную абмуроўку валоў, засведчыўшы больш позняе з'яўленне вакол замка валоў земляных. Плануецца адпаведны экскурсійны маршрут, дзеля чаго будзе адкрыты адзін з бастыёнаў... Першую чаргу комплексных работ мяркуюць завяршыць у наступным годзе. Дарэчы, яны надзвычай працаёмкія і для стороннага вока не надта заўважныя — даводзіцца, напрыклад, шмат капаць уручную; яны вымагаюць узважанага падыходу, нетаропкай дбайнасці, бо, спаборнічаючы з часам, тут можна прайграць і страціць непаўторнае. А дзяржаўнае фінансаванне работ у замку цяпер забяспечваецца рэгулярна і ў патрэбным аб'ёме.

•

Не сакрэт, з вялікімі цяжкасцямі ўдалося ўключыць Мірскі замак у Спіс сусветных прыродных і культурных каштоўнасцяў ЮНЕСКА. Усё, што знаходзіцца ў Еўропе на Усход ад Польшчы, мае слабыя шанцы трапіць у гэты спіс: не адразу пашанцавала, напрыклад, расійскім гарадам Санкт-Пецярбургу, Уладзіміру. Наш Мір увайшоў у лік асаблівых каштоўнасцяў дзякуючы таму, што замак захаваўся ў гістарычным выглядзе разам з мястэчкам. Ці мае шанц і Нясвіж трапіць у сакральны Спіс? Пра гэта гаварылі, сярод іншага, удзельнікі навукова-практычнай канферэнцыі, што ладзілася пад кіраўніцтвам прафесара У.Скараходава. ЮНЕСКА, пэўна, "прыме" не замак сам па сабе — замкаў на планеце нашай шмат, — а гістарычны горад як уладанне Радзівілаў і калыску слыннага роду, унікальнай з'явы ў гісторыі чалавецтва.

•

У юбілейным фестывалі ўдзельнічалі віцэ-прэм'ер РБ У. Дражын (ён, працуючы тады на пасадзе старшыні Нясвіжскага райвыканкама, быў сярод пачынальнікаў цудоўнай традыцыі), намеснік губернатара Міншчыны, у свой час таксама мэр Нясвіжа, Л.Крупец, першы намеснік міністра культуры Беларусі У. Рылатка. Нямала гаварылі пра тое, як неўпрыкмет фарміруе фестываль гарадское асяроддзе, якое магутнае станоўчае ўздзеянне робіць на месцічаў. І наогул, якая вялікая справа — асветніцкая, выхаваўчая, ідэалагічная — разгарнулася з лёгкай рукі маэстра М.Фінберга: правядзенне фестываляў менавіта беларускай камернай музыкі ў несталічных нашых гарадах. Наколькі гэта важна для беларусаў, якія па-гаспадарску будуюць свой новы дом, — для нашага суверэнітэту, для нашай самасвядомасці, самаідэнтыфікацыі, для аднаўлення нашага старажытнага еўрапейскага радаводу .

А М.Фінберг, прынамсі, заўважыў: "Я рады, што за гэтыя гады мы не адышлі ад самага галоўнага і граем нацыянальную музыку, адкрываем не знаёмыя шырокай публіцы творы і яны робяцца папулярнымі. За 10 гадоў прагучала больш як 370 твораў розных стыляў, для розных выканальніцкіх складаў. Гэта былі пераважна беларускія прэм'еры. І ніводнай — выпадковай, бо мастацтва на фестывалі мае навуковае абгрунтаванне. І яшчэ: мы выхавалі свайго слухача. Я ішоў па горадзе, і да мяне звярнуўся чалавек, пацікавіўся, ці будзе сёння выконвацца твор, які прагучаў у адным з нашых колішніх фестывальных канцэртаў. Дык я падумаў: вось ён, плён гэтых 10 гадоў! Тое, што ўпершыню ўдзельнічае Нясвіжская школа мастацтваў — дасягненне таксама, бо мы, увасабляючы беларускую нацыянальную ідэю, справіліся з важнай выхаваўчай задачай".

•

Вядзецца добраўпарадкаванне вуліц горада. Абноўлены будынак райвыканкама — у сучаснай камяніцы пад чырвонай дахоўкай наўрад ці пазнаеш колішнюю стандартную шэрую адміністрацыйную "каробку". Мэта —"пераапрануць" усе дамы ў гістарычным цэнтры Нясвіжа, пакрыўшы іх чырвонымі каптурамі з традыцыйнай дахоўкі або металачарапіцы. І яшчэ, каб аднавіць гістарычную справядлівасць, плануецца паставіць помнік заснавальніку горада — Радзівілу Сіротку, наконт чаго ўжо вяліся перамовы з нашым слынным скульптарам І.Міско.

Хаця апошнім часам у 2,5 раза павялічаны аб'ём будаўніцтва жылля на сяле, кіраўніцтва раёна глядзіць праўдзе ў вочы і разважае прыкладна так. Незалежна ад нашых меркаванняў колькасць вясковага насельніцтва з часам будзе памяншацца. Працэс аб'ектыўны. Таму трэба паклапаціцца пра тое багацце, якое ёсць у раёне: старажытны горад, замак, што дазволіць пры ўмелым гаспадаранні зрабіць з Нясвіжа турыстычную "Мекку" і такім чынам умацоўваць мясцовы бюджэт. Ёсць задумка стварыць філіял БАТУ, бо адчуваецца патрэба ў адукаваных кадрах адпаведнага профілю. Пачалі будаўніцтва цэнтральнай бібліятэкі, на чарзе — рэалізацыя праектаў рэстаўрацыі кінатэатра і гасцініцы.

•

Кажуць, праз год сюды зноў прыйдзе свята беларускага пісьменства і друку. Значыць, будзе зроблена яшчэ больш для добраўпарадкавання горада і развіцця яго інфраструктуры. А па вялікім рахунку — дзеля адраджэння нашых сапраўдных, спрадвечных духоўных каштоўнасцяў, без якіх існаванне сучаснай суверэннай еўрапейскай Беларусі проста не мае сэнсу .

С.БЕРАСЦЕНЬ

Фота Дзмітрыя Яшчанкі



На сценах прасторнай і светлай майстэрні — маляўнічыя пейзажы, быццам маленькія акенцы, за якімі шэпчуцца бярозы альбо ўздыхаюць азёрныя хвалі... І столькі ў гэтых краявідах цяпла і дабрыні! Нельга нават сабе ўявіць, што чалавеку, які стварыў іх, некалі давялося браць у рукі зброю і, страчваючы сяброў, бараніць родную зямлю.
Аднак нават у гады ваеннага ліхалецця ён не пакінуў улюбёную справу і таму юбілей Вялікай Перамогі сустрэў усё гэткім жа энергічным, поўным ідэй, творцам.

Ад «Лясной Траццякоўкі»

Мікалай ГУЦЕЎ — мастак і філосаф. Былы партызан.

— Шлях да творчых вяршынь... Мікалай Цімафеевіч, з чаго ж усё пачыналася?

— Гэта вельмі доўгая і складаная гісторыя. Аднойчы я, наважыўшыся, пераступіў парог рэдакцыі "Ленінскія ўнучаты" (газета ў Растове-на-Доне), папрасіў узяць мяне на працу. На той час мастацкай адукацыі я не меў, але ўжо лічыў сябе прафесіяналам. Дзіўна, але мяне прынялі ў калектыў у якасці мастака.

Пазней, у 1934-ым, дваццацідвухгадовым юнаком паступіў разам з сябрам у мастацкае вучылішча адразу на другі курс. Там маім настаўнікам быў А.Чарных, вучань знакамітага Сярова, выдатны чалавек і таленавіты педагог. Дзякуючы менавіта яму я адчуў сябе сапраўдным мастаком. Мяне нават выпраўлялі навучацца ў Ленінградскую акадэмію мастацтваў. Але з-за прыкрай выпадковасці, не па маёй віне, на экзамены я спазніўся. Пасля служыў у арміі, прайшоў усю фінскую вайну, а потым пачалася Вялікая Айчынная... Пад Вязьмай частка войскаў, у тым ліку і мая 19-ая армія, апынулася ў аблозе, і я разам з сябрамі трапіў у палон. Трэба зазначыць, нам пашчасціла на досыць чалавечнае кіраўніцтва: аўстрыйцаў, чэхаў. Да мастакоў яны ўвогуле ставіліся няблага, нават дазвалялі выязджаць на прыроду, рабіць замалёўкі. Фашысты ж не шкадавалі ваеннапалонных.

Спачатку мяне залічылі ў групу перакладчыкаў, але нямецкую мову я ведаў вельмі кепска, на школьным узроўні. Аднойчы зайшоў дзеля чагосьці ў кантору і ўбачыў там нейкага мастака. Не ўтрымаўся і сказаў, што таксама малюю. Нямецкі лейтэнант, што сядзеў непадалёку, здзівіўся, але даў мне паперу і аловак. Я зрабіў яго партрэт, ад якога той прыйшоў у захапленне.Так я быў пераведзены ў групу мастакоў.

Але, хаця жыццё ў лагеры было не такое ужо кепскае, нас цягнула на волю, да партызан. Мы пачалі рыхтавацца да ўцёкаў, рабілі так званыя аўсвайсы. Неўзабаве нас перавялі ў Бароўку, што на Полаччыне. Тамтэйшая група ваеннапалонных збіралася ўцякаць па дарозе на працу, і мы хацелі далучыцца. Але ў апошні момант кіраўніцтва нечакана загадала пакінуць нас у лагеры: маўляў, мы, мастакі, "не прывыклі быць па-за яго сценамі без канваіраў".

Памятаю, тады я сказаў: "Трэба ўцякаць. Інакш будзе позна". І мы палезлі проста праз калючы дрот.Удзень. Нягледзячы нават на тое, што нейкі немец плыў па возеры ў лодцы. Ён, пэўна, не звярнуў на нас увагі. А дзейнічаць трэба было хутка. Кожныя тры хвіліны на гэтым месцы з'яўляўся вартавы. Толькі тры хвіліны... Мы паспелі пераскочыць праз агароджу і кінуліся ў лес.

Але на гэтым прыгоды не скончыліся. Пакуль ішлі па бальшаку, сустракалі і немцаў, і паліцаяў. Але ў нас з сабою былі альбомы, мы знарок смяяліся, рабілі выгляд, што шукаем месца для эцюда. Потым, калі апынуліся на досыць далёкай адлегласці ад лагера, кінуліся бегчы і, не спыняючыся, пераадолелі кіламетраў пяць. Толькі на трэці дзень блуканняў натрапілі, нарэшце, на партызанскую брыгаду Дубава. Там нас сардэчна прынялі, і ўжо наступнай раніцай я выправіўся на першую сваю аперацыю.

— Пэўна, з-за такіх незапланаваных уцёкаў ніводнага вашага твора таго часу не захавалася?

— Наадварот. З сабою мы здолелі прыхапіць не толькі малюнкі, але і фарбы, і паперу. Таму ў атрад з'явіліся мастацка "ўзброенымі".

— Няўжо на вайне знаходзілася месца для мастацтва?

— Канечне! Мы ўдзельнічалі ў баях, а потым, вярнуўшыся ў брыгадны лагер, малявалі партрэты тых, хто вызначыўся асаблівай мужнасцю. Пасля вывешвалі іх у штабе, і такім чынам атрымалася сапраўдная галерэя, якую нават называлі "Лясной Траццякоўкай".

У нас быў цудоўны камандзір, камісар Уладзімір Лабанок. Ён, як ніхто, разумеў, якую важную ролю адыгрывае мастацтва на вайне. Аднойчы я паскардзіўся яму на адсутнасць лінолеуму, які быў так патрэбны партызанскай друкарні для вырабу гравюр. Неверагодна, але ён арганізаваў напад на нямецкі гарнізон, што знаходзіўся непадалёку. А там падлога ў штабе была засцелена менавіта лінолеумам! Нашы нечаканым агнём разагналі немцаў, заскочылі ў штаб і зрэзалі з падлогі, што паспелі. Фашысты маглі вярнуцца ў любы момант, таму больш ніякай здабычы мы не захапілі.

— Матывы партызанскага жыцця, вядома ж, адлюстраваліся ў вашай творчасці...

— На сёлетнюю, прысвечаную 60-годдзю Перамогі, выставу я прапанаваў сваю карціну, прысвечаную лётчыку Мамкіну. Ён падчас адной з аперацый, якую праводзіла наша брыгада, дапамагаў эвакуіраваць Полацкі дзіцячы дом.

Нейкім чынам атрымалася перахітрыць немцаў. Яны лічылі, што дзяцей адправяць у вёскі, дзе было не так голадна, але насамрэч іх спачатку адвезлі ў партызанскі атрад, а потым пераправілі на Вялікую зямлю. На карціне Мамкін дапамагае малым уладкоўвацца ў самалёце. А гадоў пяць таму быў створаны трыпціх "Чароўны змей". У левай яго частцы адлюстравана праца партызанскай друкарні, па цэнтры — пуск змея з падрыхтаванымі ўлёткамі, а справа — паніка ў нямецкім гарнізоне, якую выклікаў такі нечаканы "падарунак". Увогуле, вайна — невычэрпная крыніца сюжэтаў і для мастакоў, і для пісьменнікаў. Так, у выдавецкі план гэтага года ўключаны дзесяць маіх партызанскіх навел, але тыраж іх занадта малы, толькі 500 экземпляраў. Шкада... Я змог бы яшчэ нямала распавесці — і пра партызанскае жыццё, і пра нелюдства фашыстаў.

Аднойчы мне давялося рабіць замалёўкі ў спаленай вёсцы. Жудасная карціна! Вечарэла... А навокал — чорныя сцены і коміны, загінуўшыя людзі.

І дзеткі... Яны быццам паўзлі па зямлі, быццам спрабавалі схавацца ў хатах...

— Раскажыце, калі ласка, пра вашы планы.

—Цяпер я ў асноўным пішу пейзажы, але хутка мушу ўзяцца за вялікую тэматычную карціну: укрыжаванне Ісуса Хрыста. Для мяне ён, у першую чаргу, вялікі мысляр, яго запаветы — асаблівая дыялектыка жыцця. Рыхтуюся і да персанальнай выставы. На ёй будуць экспанавацца трыпціхі "Белавежская пушча", "Таполя-вяшчуння" і шмат іншага. Таксама займаюся напісаннем сур'ёзнага крытычнага артыкула. Аналізую пройдзены краінай шлях, зробленыя памылкі. У свой час я скончыў інстытут марксізму-ленінізму, таму бяру на сябе даволі вялікую адказнасць і ўключаю ў гэтую работу ўласныя філасофскія погляды.

— Чаго вы чакаеце ад сучасных мастакоў? Што пажадалі б маладым творцам і падрастаючаму пакаленню ўвогуле?

— Сучаснае беларускае мастацтва, я лічу, знаходзіцца на вельмі высокім узроўні. У нас шмат таленавітых творцаў: Міхась Савіцкі, Людвіг Асецкі, Арлен Кашкурэвіч, Алена Лось... Яна графік, але маляўнічасці яе работ, мелодыцы колераў можа па-добраму пазайздросціць і жывапісец. А што да пажаданняў... Я аддаю перавагу канкрэтным справам, якімі я здолеў бы дапамагчы моладзі. Так, я стварыў праграму навучання для ўсіх трох тыпаў нашай мастацкай адукацыі, абапіраючыся на методыку Берлінскай мастацкай акадэміі і ўласны вопыт.

У 60 — 70-ыя гады я выкладаў асновы кампазіцыі на графічным аддзяленні Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута (цяпер Акадэмія мастацтваў) і выяўляў таленавітых маладых людзей на першым курсе, а ўжо на трэцім выдавецтва, паводле маёй ініцыятывы, прапаноўвала ім план па афармленні якой-небудзь кніжкі. Цудоўна ў той час праілюстравалі дзіцячыя казкі В. Шаранговіч, Э. Агуновіч, А.Дэмарын, нельга не ўспомніць таксама У. Савіча, М. Селешчука, В. Славука... Такім чынам атрымлівалася, што выдавецкі план — гэта адначасова і вучэбны дапаможнік, і магчымасць для студэнта атрымаць неблагі заробак. Да таго ж, досыць рана раскрываліся сапраўдныя таленты. Спадзяюся, мае былыя студэнты ўспамінаюць такую практыку з удзячнасцю і задавальненнем.

Гутарыла Святлана САЎКО

Фота забяспечана аўтарам

Прагноз адносна распаўсюджвання і жыццяздольнасці сучасных моў несуцяшальны: з 6700 існуючых сёння 90 працэнтаў пазбавяцца свайго практычнага значэння на працягу бліжэйшых ста гадоў. Зараз з вялікім адрывам лідзіруе англійская мова. Больш чым у 50 краінах свету яна мае статус дзяржаўнай. Добра гэта ці кепска? Той, хто адназначна адкажа на такое пытанне, альбо звычайны невук, альбо фанат, розум якога празмерна ацяжараны Інтэрнетам, які працуе, у асноўным, на амерыканізаваным варыянце англійскай мовы. Попыт на спецыялістаў з веданнем замежнай мовы ў свеце выглядае так: нямецкая — 13 працэнтаў, французская — 7, іспанская і італьянская — 3, англійская — 77 працэнтаў.

Тое-сёе пра «Клабэліці»...

Мова — душа народа. І не важна жыве той ці іншы народ у джунглях Амазонкі ці ў снягах Крайняй Поўначы. Спрашчэнне ці свядомае занядбанне мовы на карысць тэхнатроннай прагматыкі (чорны бок глабалістыкі) вядзе да аднаго — дыктату краін, найбольш развітых у ваенным і эканамічным плане. Без усялякага перабольшвання можна сказаць: нашай планеце пагражае тыранія па-амерыканску. Страшна падумаць, што ўжо нашы дзеці і ўнукі апынуцца ў своеасаблівым духоўным гета.

Злучаныя Штаты Амерыкі, пры ўсёй іх тэхналагічнай моцы, ніяк не з'яўляюцца ідэальнай дзяржавай. Возьмем такі бок справы, як правы чалавека. Права чалавека на асабістае жыццё, да прыкладу. Вядома, любой маладзенькай прадаўшчыцы і ў галаву не прыйшло б не пазваніць у контрразведку пасля таго, як адзін з пакупнікоў патраціў у магазіне звыш 10 тысяч долараў. Яна зробіць гэта аўтаматычна. Забудзе дзынькнуць "куды трэба" — тры гады турмы. Ці яшчэ... Што, на вашу думку, павінен зрабіць лётчык стратэгічнай авіяцыі пасля таго, як сказаў колькі не абразлівых, а проста рэзкіх слоў сваёй жонцы? Ён абавязаны звязацца з начальствам і паведаміць пра "інцыдэнт". А то, калі ўсё тая ж усюдысная контрразведка даведаецца, што ў сям'і пілота адбылося нешта накшталт сямейнай сваркі, расплата імгненная — перавод з элітнай часці ў звычайную і паніжэнне ў званні. Працягваць?

Ніхто законаў ЗША, пісаных і няпісаных, ганьбіць не збіраецца. Краіна жыве згодна выпрацаванага ёю гістарычнага вопыту. Толькі ж навошта свае набыткі лічыць адзіна "цывілізаванымі", адзіна "справядлівымі"? І не проста лічыць, але і навязваць іх, часцей за ўсё грубай сілай, іншым суб'ектам міжнароднага права? Ці гэтага права ўжо, наогул, не існуе? Бот амерыканскага салдата — надзея ўсяго чалавецтва? Што найбольш уразіла мяне ў Югаславіі вясной 1999 года? Чорныя, як смоль, абгарэлыя дрэвы на нафтаапрацоўчым комплексе ў Нові-Садзе. Не разбураныя амерыканскай авіяцыяй масты-прыгажуны праз Дунай (побач з Мемарыяльным комплексам, прысвечаным памяці замучаных і расстраляных яўрэяў падчас Другой сусветный вайны — гэткая жудасная сімволіка!), а менавіта дрэвы. Гатовыя помнікі аднапалярнага свету. Аслеплыя, мёртвыя сімвалы магчымай будучыні...

Сусветна вядомы амерыканскі пісьменнік і даследчык Гор Відал у адной з сваіх кніг узгадвае назвы ваенных аперацый, якія амерыканцы праводзілі ў апошнія гады. "Вясна ў пустыні"— Кувейт, 1999 г.; "Удасканалены горн"—Боснія-Герцагавіна,1992 г.; "Забеспячэнне камфорту" — Курдыстан, 1991 г. "Сумесная ахова" ; "Высакародная накавальня"; "Зззяючая надзея"; "Саюзная гавань"; — Косава, 1999 г.; "Падтрымка дэмакратыі" — Гаіці,1994 г.; "Чырвоная фасоля" — Заір, 1978 г.; "Новае жыццё " — В'етнам, 1975 г.; "Залаты фазан" — Гандурас, 1988 г.; "Стабілізацыя" — Цімор, 1999г... Калі чытаеш падобнае, то міжволі перад вачыма ўзнікаюць кінакадры, дзе гестапавец Мюлер сентыментальна назірае за рыбкамі ў акварыуме і падкідвае ім бацькоўскай рукою патрэбны корм.

Ці трэба нагадваць, што так званыя "рэвалюцыі руж", "аксамітныя" і г.д. — аднаго поля ягадкі?

Зусім невыпадкова размову пра стан сучаснай беларускай мовы я пачаў з чыстай палітыкі. Дакладней, з бруднай палітыкі, якую праводзіць цяперашняе кіраўніцтва вялікай і магутнай краіны Злучаных Штатаў Амерыкі. Апошняя цынічна-ваяўнічая заява прэзідэнта ЗША Дж.Буша наконт Беларусі дае поўнае права на такое сцвярджэнне.



Моўныя праблемы — надзвычай складаныя і далікатныя. Увядзенне лацініцы ў Малдове без папярэдняга шырокага абмеркавання ў грамадстве сталася адной з прычын развязвання крывавай грамадзянскай вайны. Не так даўно Канстытуцыйны суд Расійскай Федэрацыі прызнаў права федэральнага заканадаўства вызначаць графічную аснову моў народаў Расіі. Такім чынам, спробы паасобных прадстаўнікоў улад Татарстана перавесці татарскую пісьменнасць з кірыліцы на лацініцу праваліліся. Бо ясна кожнаму — лінгвістычныя войны, як правіла, заканчваюцца больш сур'ёзнымі падзеямі. Далёка не ўсё гладка з ужываннем і распаўсюджваннем рускай мовы на Украіне. Крыўдзяць рускамоўных у былой савецкай Прыбалтыцы, Сярэдняй Азіі. Мова даўно ўжо стала сродкам палітычнага ціску і гандлю.

А што робіцца на моўным полі ў нас? Зацішак? Ці хмары пачынаюць збірацца? "Мова павінна быць бруднай" — заяўляе ў адной з газет кіраўнік апазіцыйнага маладзёжнага часопіса. І дадае: "Адно з першых слоў, якія мы прыдумалі — "клабэліці". З англійскай — "клубная эліта"... Паэт Сокалаў-Воюш, які жыве цяпер у Злучаных Штатах, напісаў раман, свядома ўжываючы дасюль невядомыя (дакладней, штучна надуманыя) беларускія словы, толькі з адной мэтаю: абы яны не нагадвалі рускую лексіку.

У гэты ж час сакратарыят грамадскага аб'яднання "ТБМ імя Ф.Скарыны" звяртаецца да дэпутатаў і кіраўніцтва Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь з наступным: "Закон аб мовах Рэспублікі Беларусь патрабуе зменаў". Ні больш, ні менш. Амаль ультыматум. З некаторымі "зменамі" мы пазнаёміліся. Усе гэтыя "клабэліці" — ад вачэй адвод. Нехта Саўка Зміцер, яшчэ адзін рэфарматар, на пытанне карэспандэнта, а ці новы правапіс толькі на кірыліцу разлічаны, з ахвотаю адказвае: "Так, але ўжо наступны крок— лацініца". Пра Прыднястроўе не забыліся?

Таму і прапануюць пісаць замест "воін" — "жаўнер", мерапрыемства — імпрэза, прозвішча — назвіска і г.д.

З трэскам прайграўшы 17 верасня 2004 года рэспубліканскі рэферэндум, праціўнікі Аляксандра Лукашэнкі павінны былі, здавалася б, падумаць пра адпачынак. Над тактыкай і стратэгіяй як мае быць папрацаваць. У роздуме пасядзець, сіл набрацца. Дзе там! Наадварот, украінская "аранжавая" эпапея голаў кружыць, і, другое, галоўнае, замежныя гаспадары за лейцы тузаюць і пугай пасцёбваюць. Глядзіце, які вэрхал на інфармацыйным полі ўзняўся! Радыёстанцыя "Голас Амерыкі" аб'явіла, што рыхтуе спецыяльны канал на беларускай мове. Тое ж самае выраблыла зрабіць "нейтральная" Швецыя. Пра Польшчу і Літву я ўжо не гавару. А Ватыкан? Такога сінхроннага "наезду" не было нават у гады "халоднай вайны".

Чым жа так угнявіла ўладароў свету (што я кажу, прабачце, сапраўдны ўладар свету — Бог) наша васільковая Беларусь? Можа, балістычныя ядзерныя ракеты пачала выпускаць? Ці біялагічную зброю ўпотай паставіла на канвеер? Можа, у нас выбухаюць міжнацыянальныя і міжканфесійныя канфлікты, якія могуць суседнія краіны падпаліць? Ці ў Мінску ўсталявалі "глушылкі" і ніякіх сусветных радыёнавін бедныя беларусы не пачуюць... А вы бачылі, каб нейкія "спецы" лазілі па дахах нашых дамоў і скідвалі долу тэлевізійныя талеркі? Дзесяткі каналаў. Глядзі — не хачу. У кіёсках аж вочы разбягаюцца ад назваў апазіцыйных выданняў. Што, аўтар няпраўду кажа? У адказ — працяглае маўчанне апанентаў. Пярэчыць няма чым.

Ужо каторы раз пішу: сіла Аляксандра Лукашэнкі не столькі ў ягоных даволі жорсткіх метадах кіравання (і выхавання таксама!), колькі ў сацыяльна-эканамічнай практыцы, скіраванай на задавальненне жыццёвых патрэб літаральна ўсіх пластоў насельніцтва.

Адсюль задачы непрыяцеляў Беларусі — любой цаной падарваць давер пераважнай большасці народа да ўлады. Асабліва да Прэзідэнта. Бо ў пераходны перыяд на ягонай фігуры шмат што (і хто!) спрабуе павіснуць. Нейкі пан Ялавецкі сцвярджае ў адной з цэнтральных польскіх газет, што Аляксандр Лукашэнка — найпершы антысеміт у Еўропе. Маўляў, каб было побач мора, то Прэзідэнт усіх яўрэяў ссунуў бы туды бульдозерам. Гэта не жартаўнік піша. Піша правакатар. Зацяты, крывадушны. Кранае балючую тэму. Шкрабае пяром, каб падмануць уласнага чытача. Хоча, каб вобраз Беларусі ў вачах палякаў паўстаў пачварным і гідкім. Пан Ялавецкі — тыповы натавец, а атлантыстам патрэбен перманентны вораг, пажадана ў выглядзе зацюканага "саўка", якога неабходна лячыць ад "таталітарызму". Лекі могуць быць розныя — ад зношанай вопраткі да бомбаў з уранавымі стрыжнямі. Як у Югаславіі, Іраку, Афганістане... Абсалютная хлусня пана Ялавецкага — прыклад чорнага піяра, распрацаванага яшчэ Гебельсам. Разлік на зусім маладасведчанага абываценя.

Вядома, што Закон аб мове быў прыняты пятнаццаць гадоў таму. У 1998 годзе ў яго былі ўнесены пэўныя змены. Руская мова набыла раўнапраўны статус з беларускай, цяпер яны абедзве лічацца дзяржаўнымі і раўнапраўнымі. Менавіта так вырашыла пераважная большасць беларусаў на рэферэндуме ў 1995 годзе. Не ўсім такое становішча падабаецца. Хочацца вярнуцца да палажэнняў Канстытуцыі 1994 года, дзе толькі адна беларуская мова лічылася дзяржаўнай, а руская — сродкам міжнацыянальных зносін.

Шэраг краін Еўропы афіцыйна лічацца двухмоўнымі (Ірландыя, Фінляндыя), трохмоўнымі (Бельгія), ёсць нават чатырохмоўная Швейцарыя. Тутэйшыя "тэарэтыкі" лічаць, што двухмоўе для беларуса не што іншае, як духоўны генацыд. І калі беларускамоўных школ і дзіцячых садкоў у апошнія гады стала прыкметна менш, чым гэта было на пачатку 90-х, то на падставе такой арыфметыкі робяцца гучныя палітычныя высновы, сутнасць якіх — русіфікацыя Беларусі. Імперская Расія, маўляў, працягвае сваю шматвекавую каланізатарскую традыцыю.

Што адбываецца на самай справе? Відавочнае скарачэнне ўжытку беларускай мовы, як на дзяржаўным, так і на бытавым узроўні, безумоўна, засмучае. Паспрабуем разабрацца, дзе тут істотнае, сутнаснае, і дзе другаснае, нават правакацыйна-спекулятыўнае. Справа ў тым, што найбольш шкодзяць нашай мове яе "абаронцы" — мяняюць лексіку на заходні манер і адштурхоўваюць сапраўдных рупліўцаў ад беларушчыны. Адкрытая палітызацыя адносін да роднай мовы з боку апазіцыі міжволі змушае ўлады з пэўнай насцярогаю ставіцца да тых ці іншых суполак, якія прапагандуюць і развіваюць беларускую мову: цяжка распазнаць, дзе існы клопат душы і розуму, а дзе палітычная мітусня местачковых хітраманаў. Ну, скажыце, што

дасць ім лацініца? Шляхцюкі няшчасныя!

Ёсць недапушчальныя пралікі і з боку дзяржавы. Гэта яскрава паказала судовая справа супраць апазіцыйнай газеты "Наша ніва" ў 1998 годзе ў Гаспадарчым судзе Рэспублікі Беларусь. Газета абвінавачвалася ў скажэнні нарміраванай літаратурнай мовы. Нашаніўцы суд выйгралі. Дзяржава ў юрыдычным плане аказалася не падрыхтаванай да працэсу. Прабел гэты неабходна як мага хутчэй ліквідаваць. Да нацыянальнага кансенсусу ў дачыненні да роднай мовы мы павінны прыйсці праз заглыбленае лінгвістычнае абмеркаванне яе стану ўсімі зацікаўленымі бакамі (зразумела, і пазіцыйным бокам), а ўжо потым пераходзіць да палітычных аспектаў.

Роднай беларускую мову называюць каля 80 працэнтаў грамадзян краіны. Выдатныя стартавыя пазіцыі для вырашэння любой лінгвістычнай праблемы. Але ж чаму беларуская мова так рэдка гучыць на вуліцах? Чаму невялікія тыражы нашых беларускіх выданняў? Ды і індывідуальная падпіска, як некалі казалі, на "тоўстыя" часопісы сама за сябе гаворыць. На 1 студзеня 2005 года на "Полымя" падпісаліся ўсяго 384 чытачы, на "Нёман" — 365, на "Маладосць" — 305 чытачоў. А насельніцтва — лічы дзесяць мільёнаў. Праўда, ёсць адна акалічнасць, якая ў пэўнай ступені растлумачвае незайздросную сітуацыю. Рэзка ўпалі тыражы падобных часопісаў і ў Расіі. Публіка там аддала перавагу Марынінай, Данцовай... Літаратурная папса. І ў нас яе таксама любяць. Адна інфармацыйная прастора, адны густы. Сучасная руская літаратура (і мова ў больш шырокім сэнсе) пакутуе яшчэ больш, чым беларуская. Амаль тое ж адбываецца і ў былых савецкіх прыбалтыйскіх рэспубліках. Хіба там нацыянальная літаратура мае такі ўплыў на грамадства, як, скажам, у 80-я гады? Адным словам, рынак!

Што рабіць майстрам слова, якія не могуць здрадзіць мастацтву і не хочуць пісаць рэчы, ад якіх за вярсту нясе хаўтурай і непавагай да чытача? Пісаць. Але пісаць на мяжы сваіх магчымасцей. Шчыра і пранікнёна. Як апошні раз! Толькі тады, можа, масавы чытач павернецца да твора тварам.

У беларускім літаратурным асяроддзі (звыш 500 чалавек маюць пісьменніцкія білеты, сотні кандыдатаў на падыходзе) няма ні міру, ні спакою. Адзін з вынікаў адсутнасці кансалідацыі творцаў, яснасці светапогляду — слабасць літаратурных набыткаў за апошнія гады. Набыткаў, якія б скалыхнулі грамадства, далі падставы дзяржаве паглядзець на пісьменніцкую грамаду як на дзяржаваўтваральны фактар, няма.

Сапраўдны раскол пісьменнікаў адбыўся на XI з'ездзе ў 1994 годзе. Група літаратараў (яны амаль усе ўваходзяць зараз у Беларускі ПЭН-цэнтр) прыняла, дарэчы, з падачы З. Пазняка, які пачуваў сябе ў зале сапраўдным гаспадаром, русафобскую рэзалюцыю. Дж. Сорас, фінансавы і палітычны наглядчык ПЭН-цэнтра, быў вельмі зацікаўлены ў сварцы беларускіх і рускіх пісьменнікаў. План свой, ён, прадстаўнік масонаў ажыццявіў. Якія яшчэ масоны? Звычайныя. У сацыялістычнай Венгрыі іх афіцыйна таксама не было, але, ледзь толькі ўлада змянілася, у адначассе стала аж паўтары тысячы. З неба звяліліся? Не, проста легалізавалі сваю дзейнасць. І вось і ў нас той жа лямант. Ідзе русіфікацыя. Улады душаць мову! Знішчаюць у зародку. Не даюць разгарнуцца тым, хто прытрымліваецца "тарашкевіцы", правапісу, што існаваў да 1933 года, калі бальшавікі саматугам увялі сваю "наркомаўку". І "забываюць" сказаць, што на гэтай "праклятай "наркомаўцы" тварылі Янка Купала, Якуб Колас, Кандрат Крапіва, Максім Танк, Іван Мележ, Аркадзь Куляшоў, Пімен Панчанка, Уладзімір Караткевіч, Іван Чыгрынаў, Васіль Быкаў... Спіс бясконцы!

Прыхільнікі "клясычнага" правапісу доказных аргументаў з боку афіцыйных вучоных не прызнаюць. Кажуць: яны ўсе — ангажаваныя. Паслухаем тады Масея Сяднёва, якога ў любові да беларускіх уладаў ніяк не западозрыш — падчас фашысцкай акупацыі дапамагаў сваім паэтычным словам нацыстам, а потым, збегшы на Захад, доўгі час працаваў на радыё "Свабода", якое якраз і прапагандавала тую самую "тарашкевіцу" ў сваіх перадачах, ды і цяпер тое ж самае робіць з імпэтам. Дык вось, Сяднёў у сваёй "спавядальнай" кнізе сцвярджае: "Цяжка аспрэчыць факт, што на фарміраванне беларускай літаратурнай мовы (XIX ст.) мелі ўплыў пісьменнікі польскай культуры. Яны надалі беларускай мове свой адметны коларыт, так бы мовіць, асемянілі яе і засеялі шматлікімі паланізмамі ў галіне лексікі, а ў галіне сінтаксісу надалі нашай мове некаторыя не ўласцівыя ёй звароты. У 20-я гады, у час беларусізацыі граматыка Язэпа Лёсіка ўзаконіла гэтыя "асаблівасці" беларускай літаратурнай мовы, і, такім чынам, паланізмы набылі сваё грамадзянства ў нашай літаратурнай мове..."

У 1998 годзе ў кнізе "Посттаталітарнае грамадства: асоба і нацыя" (зноў грошы Дж. Сораса!) чытаем: "Разам з тым пэўнае кола даследчыкаў разглядала жыхароў Заходняга Палесся ў якасці прадстаўнікоў большменш самастойнай этнаграфічнай і лінгвістычнай групы... Рэабілітацыя этнічнай спадчыны кожнага народа садзейнічае экалагізацыі (во слоўца ўляпілі! — **В. Д.**) свядомасці". Карацей кажучы, Заходняе Палессе спрабавалі ператварыць у "гарачую кропку". Не атрымалася. Горка прызнаваць, але значная частка пісьменнікаў падтрымлівала ў тыя гады "ідэю" заходнепалескай мовы! Цяпер, кроў з носу, трэба разбурыць канчаткова нацыянальную беларускую мову. Гвалтам, явачным парадкам "узаконіць" існаванне двух правапісаў.

Існаванне беларуска-рускага двухмоўя пры правільнай інфармацыйна-культурнай палітыцы з боку ўлады дае культурныя і матэрыяльныя дэвідэнды. Мовы роднасныя. З аднаго кораня. Нам, беларусам, не трэба траціць вялікія сродкі на пераклады навуковых прац, якіх з кожным днём усё больш і больш на глабальным рынку. І ўсё ж...

Дзяржаўным чыноўнікам таксама трэба зразумець: родную мову немаўля ўпітвае з малаком маці. Калі будзе вакол гучаць і ўжывацца адна толькі руская мова, то беларуская, безумоўна, сыдзе ў нябыт. А гэта ўжо злачынства перад чалавецтвам. І — вялікая радасць для памянёных вышэй амерыканскіх імперыялістаў. Што яны цяпер робяць? Б'юцца за "паліткарэктнасць" уласнай мовы. Цікавая і паказальная барацьба! Спярша напісалі "палітычна правільнае" Евангелле. Слоў, накшталт, "чорны", "левы" ўжо няма. Слова "чорны" можа абразіць негра... Слова "левы" можа падштурхнуць моладзь да разваг наконт сацыяльнай справядлівасці і глабалізму ў цэлым. У амерыканскіх падручніках нельга ўжываць слова "яхта". Чаму? Каб не распальваць сацыяльную варожасць. А хіба ж можна пісаць "прастытутка"? Не, ні ў якім разе! Цяпер гэта — работніца сексуальнай сферы. Магазінны злодзей — незвычайны пакупнік(!), бяздомны — пазбаўлены месца ў доме... Уявім сабе на хвілінку, што вось такую "паліткарэктнасць" прымуць народы іншых культур і цывілізацый. Што атрымаецца? Правільна, лінгвафашызм. Ці проста фашызм. Не варта забываць, што германскі нацызм — параджэнне заходнееўрапейскага этнацэнтрызму. Іх "сцяг" якраз і падхапілі цяпер Злучаныя Штаты Амерыкі!

...А нашы мясцовыя штукары-палітыканы амерыканскую "паліткарэктнасць" пасвойму разумеюць. Пішуць: не зносіны, а стасункі, не мерапрыемства, а імпрэза, не пасол, а амбасадар, не выстаўка, а выстава, не прозвішча, а назвізка, не працэнт, а адсотка, не тыраж, а наклад... Я ўжо не кажу пра "Лёндан", "калямбур" і "рэкляму"...

Адна з апазіцыйных газет заклікае "шукаць" словы. Як грыбы, ягады — знаходзіць сякеру пад лаўкай! Замест "разеткі" прапаноўвае ўжываць слова "тычка". Гэта ж слова ў беларускай мове даўно і трывала прыжылося! Тычкі на сенажаці ставяць, каб скаціну на пашу не пускалі..

Калі б змагары за "клясычны правапіс" дбалі пра родную мову па-сапраўднаму, яны не ўздымалі б пытанне "тарашкевіцы" ці лацініцы. Адзін з лідэраў БНФ на поўным сур'ёзе заявіў: "Мяккі знак дазволіць нам хутчэй інтэграваецца ў Еўропу". Гэта значыць, Пазняк пісаць як Пазьняк.

Зробім высновы.

Наяўнасць двух правапісаў беларускай мовы — гістарычны і юрыдычны нонсенс. Неабходна, на мой погляд, у сціслыя тэрміны намаганнямі вучоных і спецыялістаў і, безумоўна, прадстаўнікоў вышэйшай заканадаўчай улады выправіць становішча. Патрэбна спецыяльная Пастанова Савета Міністраў краіны ці нават Дэкрэт Прэзідэнта аб захаванні і абароне беларускай нарміраванай літаратурнай мовы.

Ці варта лішні раз нагадваць, што моўнае пытанне пры цяперашнім пастаянным інфармацыйна-псіхалагічным ціску на Беларусь, мае прамое дачыненне да нацыянальнай бяспекі і спакою ў грамадстве?

Вячаслаў ДАШКЕВІЧ, член Дзяржаўнай камісіі па выданні новых падручнікаў у гуманітарнай сферы

Калаж В. КАЛІНІНА і А. СМАЛЯКА

Віталь НАВІЦКІ — журналіст Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё, аўтар і вядучы праграм "Прававы канал", "Грамадская бяспека", "Радыёслужба бяспекі". Нарадзіўся ў 1981 годзе ў Мінску. У 2003 годзе скончыў факультэт журналістыкі БДУ, зараз — студэнт першага курса Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.



Жыццё сваё ствараю сам

— Віталь, твая першая прафесія журналіст. Чаму ты абраў яе?

— У школе я быў даволі сціплым хлопчыкам і нават пазнаёміцца з дзяўчынкай с суседняга класа доўгі час для мяне было сур'ёзнай і невырашальнай праблемай. У 15 гадоў вырашыў, што "стану новым чалавекам". І стаў ім. Але ж у новым вобразе паступаць у інстытут замежных моў ці ў эканамічны універсітэт, куды я тады хацеў, было проста немагчыма. Думаў-думаў, выбіраў... У спісе спецыяльнасцяў выкрасліў практычна ўсё, акрамя філалагічнага факультэта і факультэта журналістыкі. І канчатковым варыянтам для паступлення быў абраны журфак. Я ў нейкай ступені задаволены. Праўда, прафесія журналіста дае пакуль больш маральнае, чым матэрыяльнае задавальненне. Спадзяюся, што калі-небудзь сітуацыя зменіцца.

— Прозвішча Навіцкі вядомае ў журналісцкім асяродку. Твой бацька — выдатны спартыўны каментатар. Чаму не пайшоў па ўжо пратаптанай сцяжынцы?

— Я спецыяльна абраў неспартыўную журналістыку, каб пазбегнуць параўнанняў. Як неаднойчы падкрэсліваў мой бацька Уладзімір Навіцкі ў шматлікіх інтэрв'ю — яго сын усяго дабіваецца сам. Чым і ганарыцца. Я таксама лічу, што кожны ў жыцці павінен дабівацца поспеху самастойна. Не важна дзе і ў якой сям'і ты нарадзіўся.

— Цалкам з табою згодзен. Калі чалавек творчы, то здольнасці ў яго праявяцца самі. І як правіла, гэта адбываецца яшчэ ў школе...

— Там я вёў практычна ўсе мерапрыемствы. Лічу, што гэта быў першы вопыт працы на публіку. А вось першы артыкул напісаў недапушчальна позна — у 17 гадоў. І быў ён з дваццаці радкоў — пра жанчыну, якая працуе на заводзе халадзільнікаў. На беларускім жа радыё дэбют — матэрыял пра будаўніцтва алімпійскай вёскі ў сталіцы. Пасля гэтага спрабаваў свае сілы на АТН і быў карэспандэнтам "Нашых навін" на Агульнанацыянальным тэлебачанні.

— Ты шмат дзе працаваў. І як думаеш, журналістыка — гэта творчасць ці рамяство?

— Шматмільённы рахунак у банку і загарадны дом на беразе возера Нарач. Калі такое будзе — пачну займацца творчасцю.

— З гумарам... Дарэчы, твая вучоба ў Акадэміі кіравання — гэта што: жаданне атрымаць дыплом другой вышэйшай адукацыі, магчымасць пазнаёміцца з не творчай спецыяльнасцю, у будучым зарабіць грошай на дом за горадам?..

— Пры ўсёй павазе да выкладчыкаў факультэта журналістыкі, пасля пяці гадоў вучобы ў мяне засталося пачуццё незадаволенасці. Шчыра кажучы, маёй віны ў гэтым таксама шмат, але праз нейкі час зразумеў, што справа была ў "наборы" прадметаў у залікоўцы. Мне аб'ектыўна не хапала прававых і эканамічных ведаў. Вось і ўся матывацыя майго паступлення ў Акадэмію.

— Прававая тэматыка — твая вузкая спецыялізацыя на Беларускім радыё. Скажы, гэта руцінная праца ці "аддушына"?

— Крымінал і права цяжка назваць "аддушынай" ці руцінай. Журналіст павінен быць экспертам у любой сферы і "выдаваць" кампетэнтныя матэрыялы. Праблем з гэтай тэматыкай у мяне, на шчасце, няма. Але відавочна, што хвіліны прамога эфіру — магчымасць забыць пра ўсё. Гэта тое, чаго не хапае, калі ідзеш у чарговы адпачынак, тое, чаго не хапае ўсім былым радыёжурналістам.

— Што любіш у літаратуры, музыцы, выяўленчым мастацтве, тэатры?

— Што датычыць літаратуры — чытаю ўсё. Ад Муракамі да Сартра і ад Даўлатава да Пялевіна. Хтосьці назаве гэта сапсаваным густам, спрачацца і даказваць адваротнае не збіраюся. У сучасных аўтараў здзіўляюць не столькі сюжэтныя лініі, колькі новыя незвычайныя словазлучэнні і словаўтварэнні. Музыка — тут усё сціпла: Анжэліка Варум, выяўленчае мастацтва — пасля шэрагу замежных паездак і знаёмстваў з творамі майстроў мінулага, да сучасных аўтараў ніяк не стаўлюся. Тэатр — не мінаю расійскія спектаклі, імпануе Рускі і тэатр-студыя кінаакцёра, але, на жаль, апошнія іх спектаклі расчаравалі.

— Ведаю, што ты цікавішся эстрадай і нават нешта пісаў для беларускіх спевакоў.

— Так, разам з маці перакладаў песню для Аляксандра Саладухі на адборачны конкурс "Еўрабачанне-2004". "Take it easy guy" была адзінай кампазіцыяй, якая хоць крыху "завяла" аўдыторыю ў зале Палаца Рэспублікі. Гэта быў 100-працэнты еўрахіт, так званая "папса". Простыя словы ў куплетах і запамінальны прыпеў. Але тады стаўка была зроблена на сумесь фолку з папсой...

— Якіх вышынь хацеў бы дасягнуць?

— Амбіцыі доўгі час у нашай краіне ставілі на адзін узровень з зайздрасцю ці прагнасцю. Нават сёння, калі малады чалавек заяўляе "Я хачу стаць міністрам ці прэзідэнтам", гэта ўспрымаецца з усмешкай. Між тым, даўно даказана, што чым вышэйшая планка тваіх мараў, тым большага ты даб'ешся ў жыцці. На бліжэйшую перспектыву спадзяюся знайсці раўнавагу паміж напружанай высокааплатнай працай і сямейным шчасцем.

— Што перашкаджае дасягаць поспеху? Чаго табе не хапае?

— Запальчывы, упэўнены ў сабе і крыху расчараваны ў жыцці малады чалавек. У любых абставінах абіраю шлях самастойна, і нішто не можа перашкодзіць, акрамя малога жыццёвага вопыту. Яго і не хапае.

— І апошняе. Што называеш поспехам, а што няўдачай? Як ставішся да гэтых паняццяў?

— Поспехам лічу несумненна вялікі для майго ўзросту вопыт працы ў СМІ. 24 гады — не самы лепшы час глядзець назад. Усё лепшае — толькі наперадзе. Што да няўдач, то спадзяюся, што і праз 30 гадоў я не змагу адказаць на гэтае пытанне. А поспех?.. Правядзі ананімнае апытанне — і я буду сярод тых, хто адкажа "грошы".

Зміцер АРЦЮХ

Фота забяспечана аўтарам

Палац жыў і будзе жыць



Як усё пачыналася

Шмат якія гістарычна цікавыя мясціны знаходзяцца не на буйных шляхах, а крыху збоку. Прыклады? Калі ласка: Крэва, Ліда, Мір, Гальшаны, Нясвіж, Наваградак, Друцк, Косава... Быццам хочуць як мага больш схавацца ад надакучлівых турыстаў. Дарэчы, што датычыць Косава, — ёсць адна вельмі праўдападобная версія наконт таго, чаму праз яго не праходзяць магістралі. З даўніх пор Косава ведалі як магутны гандлёвы цэнтр, а на пачатку XIX ст. тут праводзілі восем буйных кірмашоў у год. Уплыў і багацце мясцовых гандляроў былі такімі вялікімі, што калі ўрад у 1871 годзе разгарнуў будаўніцтва чыгункі Масква—Брэст, то косаўскія "бізнесмены" палічылі, што залішняя канкурэнцыя прыезджых камерсантаў ім непатрэбная, і банальна адкупіліся. Таму і ідуць рэйкі не праз гэтае мястэчка, а ў 15 кіламетрах на паўднёвы ўсход, праз Івацэвічы.

Косава — вельмі старадаўняе мястэчка. У 1871—1872 гг. вядомы археолаг Ян Завіша падчас раскопак за дзвесце метраў на захад ад знакамітага косаўскага палаца знайшоў гарадзішча жалезнага веку. Тое, што ён там пабачыў — рэшткі вогнішчаў і фрагменты ляпніны — яскрава сведчыла, што людзі тут жылі яшчэ ў чацвёртым стагоддзі. Само гарадзішча ўяўляе сабой штучна апрацаваны пагорак вышынёй 4-5 метраў і акружана двума, а ў некаторых месцах трыма невысокімі валамі; тут жа ёсць амаль незаўважаныя ямы невядомага прызначэння. Як гэта нярэдка здараецца, наконт паходжання назвы існуе некалькі легенд. Адна з іх кажа, што падчас татара-мангольскага іга гэтае паселішча было месцам збору даніны, якую прымаў верны ханскі прыслужнік. Калі княскія абозы сустракаліся, то на пытанне, куды едуць, звычайна адказвалі: "Везу товар косому". Быццам бы з тае пары і пайшла назва. Згодна другому паданню, шмат гадоў таму ў гэтых мясцінах жыў каваль па мянушцы Косаў. Калі краіна апынулася перад пагрозай быць зваяванай манголататарамі, ён зрабіў са звычайных сялянскіх сох сотні мячоў, якімі людзі перамаглі навалу і доўгі час заставаліся вольнымі.

Першыя дакладныя летапісныя звесткі датуюцца 1494 годам, калі малады Вялікі князь Аляксандр, жадаючы схіліць да сябе шляхту ВКЛ, пачаў дарыць прадстаўнікам знатных радоў дзяржаўныя землі. Сярод знатнейшых быў і вялікакняскі маршалак Ян Храптовіч, які атрымаў мястэчка Косава з ваколіцамі. За тры наступныя стагоддзі гэтая зямля сем разоў мяняла гаспадароў. Храптовічы прадалі мястэчка Сангушкам, тыя ў 1619 годзе — Сапегам; пасля з'явіліся Чартарыйскія. А на пачатку XIX ст. Косава дасталася Пуслоўскім.

Архітэктурная рэвалюцыя

Пуслоўскія былі вельмі заможнымі гаспадарамі. Мелі шмат кароў, коней, багатых палёў і лясоў, якія даходзілі ажно да Рэчыцы. У Альберціне (частка сучаснага Слоніма) валодалі суконнай фабрыкай, дзе запусцілі першую на Беларусі гідраэлектрастанцыю; на суконнай мануфактуры ў Косава — паравую машыну і чатыры паравыя млыны. Таксама першыя ў краіне. У госці да прамыслоўцы Пуслоўскага, які атрымаў тытул графа рымскага, прыязджалі Напалеон Орда, Генрык Сенкевіч, Эліза Ажэшка і інш.

У 1838 годзе ваявода Казімір Пуслоўскі разам з сынам распачалі будаўніцтва палаца за паўтары вярсты ад мястэчка. Праект каменнага неагатычнага волата быў створаны варшаўскім дойлідам Францішкам Яшчолдам, а завяршыў будаўніцтва срэбны медаліст Пецярбургскай акадэміі мастацтваў італьянец В.Марконі — ён удала ўпісаў палац у прыгожы парк на схіле пагоркаў у выглядзе трох тэрас, з якіх адкрываліся маляўнічыя краявіды з лесам і сістэмай вадаёмаў. Замак быў вельмі падобны да сярэднявечных гатычных крэпасцяў: масіўныя гранёныя вежы па кутах галоўнага фасада, шчылінападобныя проразі ў сценах, вузкія спічастыя аркі дзвярных і аконных праёмаў, машыкулі — навясныя байніцы. Готыка стала своеасаблівым паўстаннем у архітэктуры супраць класічнага стылю, які быў у той час вельмі папулярны ў Расіі. Навукоўцы сцвярджаюць, што косаўская рэзідэнцыя Пуслоўскіх вельмі падобная да замка Гогенцолернаў у Камянцы-Зембавецкім, што ў Польшчы. Кожная з дванаццаці вежаў палаца сімвалізуе месяц года. Найбольш ураджайныя — май, чэрвень, ліпень і жнівень — увасобіліся ў цэнтральных вежах замка. Ён быў пабудаваны так, што кожны год сонейка па два з паловай дні асвятляла адзін пакой, а сістэма ўнутраных праходаў і акон давала промням магчымасць трапляць у кожны куток палаца. Існуе паданне, што ў "дзень пакоя" яго ўбіралі, упрыгожвалі і цешыліся сонечнаму дню менавіта ў ім. Усяго было 132 пакоі і залы, кожная з іх мела ўласнае прызначэнне і ўпрыгожванне. У Чорнай зале гралі ў карты; Белая, абкладзеная кафляй, — гасцёўня. Сцены завешваліся дарагімі дыванамі і габеленамі, у кожнай зале — камін, аздоблены разным мармурам і скульптурамі. У Параднай зале, што месцілася на другім паверсе, — фрэскавыя роспісы вядомага мастака Францішка Жмуркі. Аднак самым дзіўным з'яўляецца тое, што ў гэтай зале мелася падвоеная шкляная падлога, пад якой плавалі сотні экзатычных рыб. На першым паверсе месціўся невялікі звярынец, галоўнай жывёлай якога быў леў. Па начах яго выпускалі гуляць у калідоры — каб ахоўваць гаспадароў і каб слугі спалі, а не кралі сталовае срэбра.

Але Косава славілася не толькі незвычайным палацам. Пры Пуслоўскіх тут з'явіліся два касцёлы, выкананыя таксама ў стылі неаготыкі: адзін — на могілках, а другі — у мястэчку. Але і гэта не самае галоўнае. Яшчэ да з'яўлення палаца мястэчка стала знакамітым тым, што ў фальварку Мерачоўшчына (за паўкіламетра ад яго пасля і ўзвялі палац) 4 лютага 1746 года нарадзіўся Тадэвуш Касцюшка, нацыянальны герой Беларусі, Польшчы, ЗША, ганаровы грамадзянін Францыі, правадыр паўстання 1794 года за незалежнасць Рэчы Паспалітай. Дарэчы, з паўстаннямі звязана яшчэ некалькі цікавых фактаў. Так, у 1838 годзе, калі заклалі палац, з'явіўся на свет другі вядомы змагар за свабоду і незалежнасць — Кастусь Каліноўскі. А пасля паўстання пад яго кіраўніцтвам Пуслоўскіх абвінавацілі ў "спачуванні бандытам". Пазней, у 1883 годзе, сяляне вёскі Заполле Косаўскай воласці выступілі супраць размежавання зямлі. Яны вырашылі не даць землямеру ўзяцца за працу, выцягнулі пастаўлены ім слуп і знеслі.

Замак пайшоў па руках

Што ж далей адбывалася з палацам? Сам Казімір Пуслоўскі памёр, так і не дачакаўшыся заканчэння будоўлі. Не паспеў завяршыць справу і яго сын Вандалін. Трэці гаспадар, Леанард Пуслоўскі, нашчадак ваяводы, вымушаны быў прадаць палац за картачныя даўгі — яго выкупіў рускі купец Аляксандраў за 700 тысяч рублёў, а праз некаторы час прадаў яго ўдвая даражэй Ганне Трубецкой. Пасля ўладарамі замка былі княгіня Абімалек, прынц Альдэнбургскі. Новыя гаспадары і не думалі аднаўляць маёнтак — яны проста вывезлі з Косава ў Расію ўсе каштоўнасці, а сам палац зачынілі. Такім чынам, "залатое стагоддзе" гатычнага помніка архітэктуры доўжылася ўсяго 25 год.

Падчас першай сусветнай вайны палац разрабавалі і часткова зруйнавалі, а таксама знішчылі сад, у якім налічвалася 150 відаў рэдкіх раслін з аранжарэяй. Амаль штотыдзень у горадзе ўспыхвалі пажары, і тады мясцовыя жыхары вынайшлі вось што: адна са сцен хаты выкладвалася з цэглы і не мела вакон, таму калі будынак і згараў, то аднавіць яго на падмурку можна было вельмі лёгка, да таго ж не парушалася планіроўка вуліц. Пры Польшчы сядзіба належала казне; у палацы месцілася ўправа, школа пчаляроў і агаднікаў. У вялікія святы тутэйшыя бортнікі частавалі дзяцей булкамі з мёдам. Узімку 1927 года мясцовы райкам КПЗБ наладзіў дэманстрацыю супраць разгрому польскім урадам Беларускай сялянска-рабочай грамады. Пад чырвоныя сцягі сабралася больш за 1500 чалавек. Але паліцыя сустрэла іх са зброяй у руках: шасцёра былі забіты, трыццаць пяць — паранена. Больш за 60 дэманстрантаў арыштавалі і кінулі ў скляпенні палаца. Гэты дзень — трэцяга лютага — захаваўся ў гісторыі як "Косаўскі расстрэл". Пасля аб'яднання Заходняй Беларусі з БССР у рэзідэнцыі Пуслоўскіх месціўся пяхотны полк. Падчас Вялікай Айчыннай немцы зрабілі тут чатыры гета, у якія сагналі амаль усіх яўрэяў мястэчка, а яны да вайны складалі дзве трэція яго насельніцтва. Увогуле, у параўнанні з даваеннымі часамі, колькасць жыхароў Косава скарацілася ў сем разоў. Але і "нашы" не спалі. Паспяхова дзейнічала падполле, актывісты якога вялі агітацыю сярод людзей, перадавалі партызанам зброю і звесткі аб нямецкіх войсках, парушалі лініі сувязі, разбіралі масты і разам з партызанамі прынялі ўдзел у Косаўскім баі, калі 480 байцоў трох партызанскіх злучэнняў ліквідавалі фашысцкі гарнізон і цэлы месяц заставаліся гаспадарамі мястэчка. А ўжо ў 44-м партызаны спалілі і сядзібу Тадэвуша Касцюшкі (за тое, што ў ёй месціўся фашысцкі штаб), і сам палац (бо немцы маглі ў ім зрабіць засаду). Старажылы расказваюць, што дзесяць дзён слуп дыма курыўся над чорным шкілетам замка.

Праблемы і турботы: падзенні і ўзлёты

Паступова палац стаў руйнавацца. Распавядаюць, што каменныя пліты агароджы пайшлі на будаўніцтва ўзлётнай паласы. Магчыма, і сам палац расцягнулі б па цаглінах, ды толькі будаваць 165 год таму ўмелі добра: па старажытных "рэцэптах" падмешвалі ў цэмент кроў жывёл і яйкавы жаўток. Ну, не ўдалося разабраць, дык хоць сляды пакінем — і ўвесь будынак стаў пакрыты надпісамі накшталт "смерць турыстам" ці "ПТУ—231". Некаторыя з іх размешчаны на самым версе. Гэта ж трэба: з рызыкай для жыцця паўзці па сценах, каб пакінуць аўтограф "Серёга" ці падобны. А адзін з іх, увогуле, датаваны аж 1956 годам. Так працягвалася да тае пары, пакуль па краіне не прайшла хваля валанцёрства. У Косава з ініцыятывай "Косаўскаму палацу — жыць!" таксама пачалі прыязджаць студэнты на некалькі дзён, а то і тыдняў. Яны збіралі смецце вакол палаца, знішчалі, дзе маглі, надпісы. І нават паставілі на дарозе самаробны драўляны ўказальнік "Палац Пуслоўскіх, 1838 г". Праз нейкі час і ўлады ўзгадалі, што яны таксама адказныя за захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, і ўказальнік замянілі на новы, металічны. Адночы вырашылі правесці тут буйны музычны фэст "Пяючыя сцены", заяўкі на які падалі больш дваццаці гуртоў і выканаўцаў. А ў апошні момант усё адмянілі.

Некалькі год таму ў Косаўскім палацы пабывалі эстонскія краязнаўцы і літаральна жахнуліся: такім занядбаным ён быў. Трэба сказаць, што яны ў сваёй маленькай краіне агледзелі ўсе падобныя збудаванні, касцёлы, манастыры і г.д. і нават дапамаглі кожнаму(!) аб'екту знайсці новых гаспадароў, якія ўжо і падтрымліваюць іх у належным стане. Вось і на гэты раз эстонскія энтузіясты вырашылі сур'ёзна ўзяцца за справу. Адной з галоўных мэт паставілі зарэгістраваць палац у спісе сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Яны далучыліся да беларускіх валанцёраў; у Інтэрнеце на эстонскім дамене зрабілі вельмі якасную старонку Косаўскага палаца — www.infonet.ee/kossovo, дзе сабрана шмат фотаздымкаў і газетных публікацый пра гэтую каштоўнасць. Але дайсці да ЮНЕСКА складана: там прымаюць заяву толькі той краіны, якой помнік належыць. А для гэтага спачатку трэба правесці сур'ёзную рэстаўрацыю. Зрабілі падлікі — і выйшла, што для такой справы патрэбна 7 мільёнаў долараў. А ў Івацэвіцкім раённым выканкаме, якому належыць палац, такіх грошай няма. Было некалькі іншых праектаў — напрыклад, прыватныя арганізацыі збіраліся выкупіць будынак і зрабіць там музей, гасцініцу. Але згодна нашаму заканадаўству, такая ўласнасць не прадаецца, яе можна толькі арандаваць, рабіць інвестыцыі, супрацоўнічаць з дзяржавай. Бізнесоўцам жа былі патрэбны цвёрдыя гарантыі. Вось так і разышліся. Трэба сказаць, што ў сярэдзіне сямідзесятых ужо адбылася адна спроба рэстаўрацыі. На жаль, няўдалая: былі раскапаны скляпенні, з-за чаго ў будынак сталі зацякаць грунтовыя воды. Пачаў крышыцца цэмент, абваліліся апошнія перакрыцці... Таму ўсе працы трэба ўзгадняць з Міністэрствам культуры і Дэпартаментам па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі. А студэнты-валанцёры не маюць права самастойна праводзіць рэстаўрацыйна-кансервацыйныя работы.

Жывая вада ажывіць палац

Але не трэба думаць, што ўсё зусім дрэнна. Мінулай вясной улады ўсё ж узяліся за справу: змылі ўсе надпісы са сцен, вырубілі лясок, які хаваў палац ад людзей, вывезлі ўсё смецце. Хоць і павольна, але аднаўленне ідзе. Таксама пачалі адбудоўваць і сядзібу Тадэвуша Касцюшкі: зацікаўленыя амерыканцы выдзелілі грошы, і зараз хата зроблена ўжо цалкам на тым самым падмурку. Побач стаіць камень з мармуровай дошкай: "У хаце, якая стаяла на гэтым месцы, у 1746 годзе нарадзіўся Тадэвуш Касцюшка, выдатны палітычны дзеяч Польшчы". Хтосьці дапісаў блакітнай фарбай: "Беларусі".

На тэрыторыі калгаса "Бусяжскі" прабілі новую свідравіну для здабычы мінеральнай вады. Афіцыйна было пацверджана, што яна з'яўляецца лекавай. І зараз пакаштаваць "Палацавую" можна не толькі на тэрыторыі Івацэвіцкага раёна, а і па ўсёй вобласці, і нават у Мінску. З дарэвалюцыйных архіваў стала вядома, што лячыцца гаючай вадой сюды, у вёску Рацкевічы — месцазнаходжанне падземнага мінеральнага мора — прыязджалі знатныя вяльможы з усёй Еўропы. У нашыя часы сюды наведваецца Антоній Лупрэа — жыхар Сан-Францыска, далёкі нашчадак Радзівілаў. Ён кожны раз аглядае палац, а пасля завітвае ў Рацкевічы і набірае з сабой вельмі шмат мінералкі, якую пілі яго продкі, і звозіць за акіян, у Амерыку. Быццам падтрымлівае сувязь з Радзівіламі, спажываючы тую самую ваду, што і яны.

Зараз у Косава жыве толькі дзве з паловай тысячы жыхароў. Мясцовыя ганарацца гэтым: іх горад і Дзісна на Віцебшчыне — самыя маленькія гарады ў рэспубліцы. Карэнных жыхароў тут прынята называць кішарамі, а прыезджых — навалаччу.

Аляксандр ЛЫЧАЎКА

Фота аўтара

У Іванава — да грамадзяніна Еўропы

Пра Напалеона Орду (1807 — 1883) — знакамітага мастака-графіка, музыканта, кампазітара, тэарэтыка музыкі, педагога, публіцыста, мецэната, паўстанца, падарожніка, вялікага патрыёта свайго краю, ураджэнца в. Варацэвічы Іванаўскага раёна — напісана і сказана за апошнія паўтара дзесятка гадоў дастаткова для таго, каб жыхары Іванава і яго ваколіц перасталі атаясамліваць гэтае імя з французскім імператарам-заваёўнікам, аднак далёка-далёка не ўсё. На такую думку навяла прысвечаная згаданай выбітнай гістарычнай асобе навукова-практычная канферэнцыя, якая прайшла ў Іванаве.

Так, старшыня праўлення Брэсцкага абласнога грамадска-культурнага аб'яднання імя Н. Орды Віталь Клімчук распавёў пра яго як пра вялікага грамадзяніна Еўропы: з 76 гадоў жыцця 26 ён правёў у Парыжы, дзе графічным майстэрствам авалодаў у студыі П'ера Жырара (пасля аб'ездзіў з планшэтам Англію, Шатландыю, Галандыю, Партугалію, Іспанію, Алжыр, Скандынавію, замалёўваючы помнікі архітэктуры ды мясціны, звязаныя з вядомымі гістарычнымі падзеямі — гэтымі малюнкамі і па сёння ілюструюцца шматлікія турыстычныя даведнікі ў згаданых краінах), музіцыраваў разам з Шапэнам і Лістам, у 1873 годзе выдаў у Варшаве "Граматыку музыкі", якая доўгі час лічылася лепшым дапаможнікам для выкладчыкаў музыкі і вучняў.

Гісторык-журналіст і краязнаўца з Мінска Анатоль Валахановіч распавёў пра Орду як пра мастака пейзажнай архітэктуры, а таксама пра яго жыццё і творчасць. Ён засяродзіў увагу слухачоў на тым факце, што, пачынаючы з 1872 года, наш зямляк выдаў за ўласныя сродкі восем буйнафарматных каляровых альбомаў-літаграфій, у якіх паказаў змаляваныя з натуры гістарычныя мясціны — у тым ліку палацы, рэзідэнцыі, крэпасці, будынкі — на тэрыторыі цяперашніх Беларусі, Украіны, Польшчы, Літвы. Практычна ён захаваў для нашчадкаў усё тое, што магло пераканаўча сведчыць пра прыгажосць і цывілізацыю роднага краю.

Выкладчык Беларускага дзяржаўнага педуніверсітэта імя Максіма Танка Леанід Акаловіч пазнаёміў з генеалогіяй Н. Орды, нагадаўшы, што яго прозвішча паходзіць ад слова Арда (Залатая Арда), а род — ад асіміляванага татарына, які атрымаў тут землі ў сярэдзіне XVII стагоддзя.

Шмат цікавага паведамілі слухачам спецыяліст турыстычнай фірмы "Заслаўль — Тур" Ігар Гатальскі, кіраўнік гісторыка-краязнаўчага аб'яднання "Прылуцкая спадчына" Інеса Кароль, археолаг, кандыдат гістарычных навук Валянцін Собаль, дырэктар абласной бібліятэкі імя Горкага Тамара Данілюк ды іншыя прамоўцы. А журналіст "Пінскага весніка" і краязнаўца Вячаслаў Ільянкоў не толькі расказаў пра пінскія дарогі і пінскі перыяд жыцця Напалеона ў сваякоў — славутых Бутрымовічаў, але і перадаў іванаўцам досыць каштоўныя дакументы, сярод якіх адбітак партрэта маці Орды — Юзефіны.

Адраджэнне велічнага імя — не толькі справа гонару беларусаў. Гэта яшчэ і стварэнне станоўчага іміджу краіны ў замежжы. Пасол па асобых даручэннях Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь Наталля Дрозд, у прыватнасці, прыгадала досыць паказальную гісторыю на гэты конт. Калі аднойчы падчас гутаркі з французскімі калегамі яна абмовілася, што Напалеон Орда — беларус, тыя напачатку вельмі здзівіліся, бо былі перакананыя, што ён паляк, а пасля больш дэталёвага азнаямлення з лёсам знакамітасці іх цікавасць да Беларусі і беларусаў падвоілася. Зараз МЗС дамаўляецца з французскім бокам аб перадачы копій пісьмаў Орды сваім сябрам ды некаторых іншых дакументаў. Мяркуецца, што гэтыя каштоўныя экспанаты апынуцца ў Іванаве ўжо сёлета.

Тым часам у Варацэвічах працягваецца стварэнне Цэнтра Напалеона Орды, які па завяршэнні ўсіх работ прадстане перад наведнікамі ў абліччы сядзібна-паркавага ансамбля. Для яго і збіраюцца экспанаты. Дзеля таго, каб адкрыць комплекс да 200-гадовага юбілею славутасці, г.зн. праз два гады, патрабуецца выключна напружаная праца. І найперш у плане вышукання сродкаў. Балазе, гэтая справа, як вынікала са слоў кіраўніка Цэнтра Ларысы Дрычыц і загадчыка аддзела культуры Іванаўскага райвыканкама Уладзіміра Шэляговіча, знаходзіць разуменне на ўсіх узроўнях: ад старшыні мясцовай гаспадаркі "Снітава-Агра" Анатоля Глінніка да рэспубліканскіх органаў улады. Ужо адно тое, што аргкамітэт па падрыхтоўцы да юбілейных мерапрыемстваў узначаліў віцэ-прэм'ер беларускага ўрада Уладзімір Дражын, сведчыць пра многае дый проста абнадзейвае.

Тым часам аднымі толькі дакладамі ды абмеркаваннем праблем работа канферэнцыі не абмежавалася. Яе выдатна аздобілі паланезы ды вальсы самога Орды ў выкананні сучаснікаў, літаратурная кампазіцыя "Няхай назаўжды застанецца ў сэрцах святое імя" з вершаў паэтаў Іванаўшчыны, а таксама дакументальны фільм "За брамай забытых мелодый" пра вялікага Грамадзяніна Еўропы і нашага слыннага земляка, імя якога носіць сёння іванаўская школа мастацтваў і адна з новых вуліц горада, а помнік яму ўпрыгожвае цэнтр Іванава. Пабывалі ўдзельнікі канферэнцыі і на тым месцы, дзе некалі знаходзіўся магільны склеп Ордаў, у якім побач з маці быў пахаваны і ён сам. Цяпер тут устаноўлены памятны знак.

Анатоль КРЭЙДЗІЧ

***НА ЗДЫМКАХ:** помнік славутаму продку ў цэнтры Іванава; памятны знак на месцы пахавання Напалеона Орды.*

Фота аўтара.

ЗАХАРАВА, 19

Пішыце на адрас: 220005, Мінск, вул. Захарава, 19, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва";
e-mail: minsk@lim.by
Адрас у Інтэрнеце — www.lim.by

Паміж кубкам і вуснамі

(Працяг. Пачатак на стар. 9)

• На кухні пацешна пабулькваe, імітуючы голас нейкай знаёмай птушкі, буталь з дамашнім віном. Яму яшчэ далекавата да маіх "кубка" з "вуснамі", але гэта радасць і сонца майго новага лета. І мне нават ад гэтага прыемна.

• Міхась Казлоўскі расказваў мне пра пахаванне Міколы Капыловіча. Быў халодны і марозны зімовы дзень. І тут жа на могілках (хавалі пісьменніка ў Маладзечне) з'явілася нейкая маленькая птушачка, скокнула на грудзі нябожчыка, прабегла па іх і тут жа адляцела. І адразу ў кожнага выдыхнулася здагадка: "А можа, гэта была сама душа чалавека?"

• Ну, што ж, і такая служба на сённяшні дзень, пэўна што, патрэбная: служба па ўбою БРС і свіней. Слухаў гэта ўсё з вуснаў нейкага спецыяліста, што выступаў па тэлебачанні, і разгадваў абрэвіятуру. Са свіньмі ўсё як быццам зразумела. А БРС што такое? А вунь яно што — буйная рагатая скаціна. Хопіць, падумаў, нашаму Франку аднаму на пяць вёсак свежаваць вепрукоў — давайце службу!

Ах, гэтыя абрэвіятуршчыкі. Тут і БаНС само сабой напрасілася. А гэта што значыць? Ды ўсё проста — буйная, але не рагатая скаціна. Толькі прашу не шукаць у гэтым нейкі падтэкст.

• Калгасныя пастухі — параўноўваў гэтых каля лецішча і сваіх, навікоўскіх — усе як на адзін твар: з чарнатою няголенасці і чырванню заўсёднага падпітку. Яшчэ ў машыне пачуў іх свіст праз пальцы, прыпыніўся і бачу: насустрач бяжыць хлапчына:

— Гною трэба?

— А як жа — трэба.

— Тады гані на бутэльку.

— Дык я скокну прымчу бутэльку "белай".

— Не, гарэлкі мы не п'ём. Вялікую — віна. А купім мы самі, давай грошы. Так і старгаваліся.

• Яна выйшла замуж за ўзбека.

"Стройны, чарнявы, прыгажун..." — гэта з характарыстыкі вяскоўцаў. Павёз ён недзе за свет сваю Галю. А неяк летам прыехаў у госці і во, якую адпаліў штуку. Калі неяк Галя правінілася, ён распрануў яе дагала і, голую, з нейкім прутам у руцэ прагнаў ад крамы і назад, лічы, праз усю вёску. Тады пра яго загаварылі інакш. Вяскоўцам, асабліва мужчынам, гэта спадабалася.

• Рэжысёры часта бываюць жорсткімі.

Яго, маладога акцёра, для той жа масоўкі загрыміравалі пад сямідзесяцігадовага. Пасля чарговых здымкаў ён прысеў на нейкую скрынку, зацягнуўся цыгаркай і ўздыхнуў:

— Мне сумна. Цяпер я ведаю, якім буду ў сваім сямідзесяцігадовым узросце.

• За вокнамі вагона ўжо даўно ляжала зіма, а ў маладзечанскай электрычцы яшчэ ўсё галёкаў ролік старога запісу: "У сувязі з наступленнем вясенне-летняга перыяду не паліце ў лесе кастроў".

Але ж цяпер каля іх, кастроў, толькі і сагрэешся.

• Ён быў з тых хітруноў, хто дасведчанасць іншых вывяраў пытаннем нібы самому сабе, хоць адказ на яго добра ведаў. Усё гэта нагадвала нейкі красворд хітрасці.

— Дык як там у Лермантава?.. — дапытліва прыжмурваў вока. І калі бачыў, што субяседнікі "плаваюць", унутрана радаваўся, нават хваліў сам сябе.

• Вясковы дзядуля добра-такі карыстаўся агульнай лядоўняй, што стаяла на калідоры гарадской бальніцы. Калі дачка неяк наведалася да старога і пачала выкладваць з сумкі прадукты, той нават узлаваўся:

— Што ты ўсё носіш мне? У нас тут цэлы халадзільнік усяго.

— Тато, маўчыце, — цыкнула дачка. — Гэта ж вы елі чужое.

• З рэкламы радыё:

— Вы любіце соль? Купляйце мазырскую соль "Экстра"! і далей:

— Патрабуюцца салісты ў дзіцячы хор радыё!

• Пра аднаго скупога калегу знаёмы рэдактар неяк сказаў мне такое:

— Хай бы ён і ў творах сваіх быў такім жа скупым ды ашчадным. А то сыпане сваёй меддзю (хаця б манетамі), а то лісцем так, што і сцежкі ніякай нябачна.

Кнігі можна набыць у Рэдакцыйна-выдавецкай установе "Літаратура і Мастацтва". Тэлефоны аддзела маркетынгу і рэкламнай дзейнасці: 284-79-65; (факс) 284-82-04.

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва" смуткуе з прычыны смерці КУЛЯШОВАЙ Аксаны Фёдараўны, жонкі народнага паэта Беларусі Аркадзя КУЛЯШОВА і выказвае шчырае спачуванне родным і блізкім нябожчыцы.

Вялікія скарбы маленькага гарадка

Непадалёк ад Гомеля знаходзіцца мястэчка Ветка, якое мае найцікавейшы музей у краіне. Да нашых дзён тут захаваліся старадаўнія народныя традыцыі і своеасаблівае мастацтва.

Заснаваны быў горад Кузьмом і Стэфанам, якія разам з 12 сем'ямі прыехалі на землі Беларусі ў 1680-х гг. Засялілі Ветку выхадцы больш чым з 20 губерняў Расіі (Масквы, Яраслаўля, Калугі, Курска і іншых). Былі гэта пераважна рамеснікі і купцы.

Знаходзіў тут прыстанак і Емяльян Пугачоў. Невыпадкова ўжо ў XVIII ст. Ветка дасягнула значнага росквіту,стала буйным рамесным і гандлёвым цэнтрам. Аднак заможнае жыццё мястэчка доўжылася нядоўга: паводле ўказаў царскага ўрада, Ветка падлягала пад жорсткія разгоны, двойчы была спаленая (1734, 1764). Горад згубіў ролю цэнтра гандлю і рамяства, але ў стараверскім асяроддзі захаваў свой гістарычны і культурны аўтарытэт.

Самадзейны мастак Веткаўшчыны

Дзякуючы гістарычным асаблівасцям развіцця краю і мясцовым жыхарам у культуры Веткі захаваліся традыцыі XVII ст. І цяпер сустракаюцца тут старадаўнія абразы, крыжы на варотах, весніцах, студнях, надмагіллях, на покуці ў хатах, кладуць іх на грудзі нябожчыку.

Усе гэтыя з'явы не маглі пакінуць абыякавым чалавека творчага, сапраўднага мастака, якім быў Фёдар Рыгоравіч Шкляраў (1925—1988). У 1960-м годзе ён пачаў збіраць калекцыю прадметаў быту, археалогіі, старадрукаў, рукапісаў, абразоў — сапраўдных помнікаў культуры і мастацтва свайго краю. Хутка калекцыя зрабілася вядомай і неаднойчы выклікала вялікі інтарэс з боку журналістаў, навукоўцаў, работнікаў культуры і асветы.

Шмат намаганняў прыклаў Фёдар Рыгоравіч, каб пераканаць улады ў неабходнасці стварэння музея ў горадзе. Нарэшце, 28 лістапада 1978 года з'явілася Пастанова Савета Міністраў БССР аб стварэнні ў Ветцы музея народной творчасці. Пад музей аддалі двухпавярховы будынак у гістарычным цэнтры горада. Пачалася яго рэканструкцыя па праекце архітэктара Л.І. Асенняга. А сам музей часова размясціўся ў невялікім драўляным доме.

Ужо ў першы год існавання музея Фёдар Рыгоравіч перадаў больш за 400 экспанатаў з уласнай калекцыі, паклаўшы пачатак камплектаванню фондаў.

Калекцыя хутка расла. Сапраўдным падарункам стала набыццё кнігі "Апостал" рускага першадрукара Івана Фёдарава, выдадзенай у 1574 годзе.

У 1984 годзе была закончана рэканструкцыя музея. Пачалася работа над стварэннем экспазіцыі. Трэба адзначыць, што ўпрыгожваннем займаліся самі стваральнікі і супрацоўнікі музея.

1 лістапада 1987 года адчынілася першая экспазіцыя. Ф.Р. Шкляраву было прысуджана званне заслужаны работнік культуры, а музей быў уключаны ў міжнародны турыстычны маршрут.

Праз год нечакана памёр Ф.Р.Шкляраў. Другім дырэктарам музея стала Галіна Рыгораўна Нячаева, якая ўнесла вялікі ўклад у заснаванне і станаўленне музея.

Працяг жыцця

Але чарнобыльская аварыя абвясціла свае правілы існавання. Пачалося адсяленне жыхароў Веткаўскага раёна з забруджанай зямлі. Больш 60-ці вялікіх і малых вёсак зніклі з карты раёна. У такіх цяжкіх умовах супрацоўнікі музея працягвалі збіраць прадметы традыцыйнай культуры, ездзілі ў адселеныя раёны, ратавалі ад знішчэння дзесяткі і сотні прадметаў народнага жывапісу, ткацтва, быту.

Толькі дзякуючы пільнай працы супрацоўнікаў, музею ўдалося застацца на старонках гісторыі нашай краіны.

І вось ужо ў 1991 годзе экспанаты калекцыі Веткаўскага музея былі прадстаўлены на выстаўцы ў Галандыі, падчас правядзення там Дзён культуры Беларусі.

Каб набыць сваіх пераймальнікаў яшчэ ў 1981 годзе пры школе працоўнай моладзі быў створаны клуб "Спадчына". У 1986 годзе распрацавана праграма "Аз, букі, ведзі — глаголь дабро!", па якой займаюцца вучні і выхаванцы дзіцячых садкоў горада.

У 1999 годзе ў Гомелі быў адчынены філіял Веткаўскага музея, а ў студзені 2000 года там адбылася першая выстаўка.

Скарбы музея

Зараз калекцыя музея налічвае каля 6960 экспанатаў, 3650 адзінак асноўнага фонду (на пачатак 2000 года). Найбольш каштоўныя ў калекцыі — старадрукаваныя кнігі, якія прыносілі ў Ветку стараверы з канца XVII ст. Збор Веткаўскага музея налічвае больш за 500 помнікаў XVI — пач. XX стст. і дае амаль поўнае ўяўленне аб кніжнай культуры Веткаўшчыны і яе традыцыях.

Сярод рэдкіх выданняў — кнігі першых рускіх і беларускіх майстроў: І.Федарава і П.Мсціслаўца ("Апостал", 1574, Львоў; "Евангелле вучыцельнае", 1569, Заблудаў); Андроніка Цімафеева Невежы ("Трыодь каляровая", 1591; "Апостал", 1597, Масква), а таксама копіі гэтых кніг; кнігі лепшых майстроў маскоўскіх друкарняў першай паловы XVII ст.: І. А. Нявежына, Фафанава, Бурцава, Іванова, Радзішэўскага. У музейнай калекцыі таксама першая кніга друкарні Кіева-Пячэрскай Лаўры ("Анфалагіен", 1619). Багата і рукапісных кніг XVII — пач.XX стст. Мясцовыя рукапісы вылучаюцца вялікай разнастайнасцю элементаў распіснога арнаменту.

У зборы музея значнае месца займае калекцыя мясцовага іканапісу XVIII — пач. XXстст. — больш за 600 экспанатаў. Ветка стварыла своеасаблівую школу іконнага пісьма, якая пераняла традыцыі старажытнарускага іканапісу і працягвала існаваць да пачатку XX ст.

Сабрана ў музеі значная калекцыя традыцыйнага адзення жыхароў Веткаўшчыны (каля 700 экспанатаў). Са старадаўніх часоў Веткаўшчына лічылася адной з багацейшых мясцін Беларусі па разнастайнасці традыцый ткацтва і вышыўкі. Больш чым з 1200 адзінак складаецца гэта калекцыя. Прадстаўлены ў ёй абрусы, посцілкі, дываны, ручнікі.

У музеі ствараецца унікальны фонд фота- і відэаматэрыялаў, дзе зафіксаваны мясцовыя святы, абрады, тэхналагічныя працэсы.

За гады работы музея яго наведала больш за 300000 чалавек. Праведзена 7735 экскурсій для дзяцей і дарослых, прачытана 650 лекцый. Адбылося 125 выставак. Супрацоўнікі музея зрабілі 500 экспедыцыйных паездак па раёнах Гомельскай, Магілёўскай, Бранскай, Чарнігаўскай абласцей. Яны ўдзельнічаюць ў навуковых канферэнцыях, семінарах, рыхтуюць да друку вынікі навуковых даследаванняў. Дырэктар музея Г.Р. Нячаева — добра вядомы ў рэспубліцы спецыяліст па вывучэнні традыцыйнай культуры і мастацтва.

Веткаўскі музей народнай творчасці зарэкамендаваў сябе як Дом захаванай культуры не толькі Беларусі, але і іншых славянскіх краін. Па яго экспанатах можна прасачыць гісторыю станаўлення і росквіту культуры нашага краю. Углядаючыся ў прадметы мастацтва, як бы гартаеш кнігу самага цэннага, што было ў нашых продкаў, дакранаешся да гісторыі, разумееш, што без памяці і шанавання мінулага няма будучыні.

Ганна ПЕРАПЯЛЮК,
студэнтка факультэта журналістыкі БДУ

Фота аўтара

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА II ПАЎГОДДЗЕ 2005 ГОДА!

«Літаратура і мастацтва»
Індывідуальная (індэкс — 63856)
на 1 месяц — 3500 руб.
на 3 месяцы — 10500 руб.
Ведамасная (індэкс — 638562)
на 1 месяц — 4800 руб.
на 3 месяцы — 14400 руб.
Льготная (індэкс — 63880)
на 1 месяц — 3800 руб.
на 6 месяцаў — 22800 руб.

"Маладосць"
Індывідуальная (індэкс — 74957)
на 1 месяц — 3600 руб.
на 3 месяцы — 10800 руб.
Ведамасная (індэкс — 749572)
на 1 месяц — 4800 руб.
на 3 месяцы — 14400 руб.
Льготная (індэкс — 00731)
на 1 месяц — 3700 руб.
на 6 месяцаў — 22200 руб.

"Полымя"
Індывідуальная (індэкс — 74985)
на 1 месяц — 3500 руб.
на 3 месяцы — 10500 руб.
Ведамасная (індэкс — 749852)
на 1 месяц — 4500 руб.
на 3 месяцы — 13500 руб.
Льготная (індэкс — 00727)
на 1 месяц — 3700 руб.
на 6 месяцаў — 22200 руб.

"Всемирная литература"
Індывідуальная (індэкс — 74863)
на 2 месяцы — 3800 руб.
на 4 месяцы — 7600 руб.
Ведамасная (індэкс — 748632)
на 2 месяцы — 4800 руб.
на 4 месяцы — 9600 руб.
Льготная (індэкс — 00729)
на 2 месяцы — 4000 руб.
на 6 месяцаў — 12000 руб.

"Нёман"
Індывідуальная (індэкс — 74968)
на 1 месяц — 3500 руб.
на 3 месяцы — 10500 руб.
Ведамасная (індэкс —749682)
на 1 месяц — 4500 руб.
на 3 месяцы — 13500 руб.
Льготная (індэкс — 00728)
на 1 месяц — 3700 руб.
на 6 месяцаў — 22200 руб.

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Уладзімір ДАВЫДОЎСКІ (в. а. намесніка галоўнага рэдактара)
Віктар КАВАЛЁЎ
Янка ЛАЙКОЎ
Інеса ПЕТРУСЕВІЧ
Ірына ШАЎЛЯКОВА
Наталля ЯКАВЕНКА

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220005, Мінск,
вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
галоўны рэдактар — 284-66-73
намеснік галоўнага рэдактара — 284-66-73

АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-81-53
паэзіі, літаратурнага жыцця, крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы — 284-66-73
музыкі, тэатра, кіно і выяўленчага мастацтва — 284-81-53
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: minsk@lim.by

Адрас у Інтэрнеце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Ф. Скарыны, 79

Індэкс 63856 Наклад 2993
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 1.06.2005 у 11.00

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва"

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 649

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12